КУЛЬТУРА

штотыднёвая грамадска-палітычная газета | выдаецца з кастрычніка 1991 года | № 48 (1695) | 29 лістапада 2024 г.

9 771994 478007 24048

Маладзечна, Гомель, Жлобін, Пінск, Бабруйск, Магілёў… Маштабная грамадска-культурная акцыя “Марафон адзінства” крочыць па краіне з 17 верасня. Наперадзе па курсе — Віцебск.

Працяг тэмы на стар. 2

Звыш 1,5 мільёна подпісаў — за дзейнага Кіраўніка дзяржавы

У нашай краіне працягваецца збор подпісаў у падтрымку вылучэння кандыдатаў на пост Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Кампанія стартавала 7 лістапада і завершыцца 6 снежня: ініцыятыўныя групы збіраюць подпісы месяц. Каб афіцыйна стаць кандыдатам, трэба выканаць шэраг патрабаванняў. Адно з іх — перадаць у Цэнтральную выбарчую камісію не менш за 100 тысяч подпісаў грамадзян. На 21 лістапада за вылучэнне дзейнага лідара сабрана звыш 1 мільёна 581 тысячы подпісаў, і работа працягваецца.

Аляксандр Лукашэнка 21 лістапада сустрэўся з кіраўніком і каардынатарамі сваёй ініцыятыўнай групы. Перадусім Прэзідэнт падзякаваў Федэрацыі прафсаюзаў і яе старшыні Юрыю Сянько за жаданне заняцца гэтай надзвычай цяжкай працай:

— Я вельмі ўдзячны ўсім вам — каардынатарам і тым групам, якія створаны ў рамках ініцыятыўнай групы.

Дарэчы, у ініцыятыўнай групе Аляксандра Лукашэнкі больш за 17 тысяч чалавек. Прэзідэнт прызнаўся, што калі б спатрэбілася сустрэцца з усімі адразу, то гэта было б практычна немагчыма зрабіць — менавіта з прычыны шматлікасці. Тым не менш праз кіраўніка групы — старшыню Федэрацыі прафсаюзаў Юрыя Сянько — і каардынатараў Аляксандр Лукашэнка перадаў падзяку ўсім, хто ўключыўся ў агульную справу.

— Хачу вам шчыра падзякаваць за тую работу, якую вы правялі і праводзіце. Не ведаю, як гэта назваць. Дапамога, напэўна, дзейнаму Прэзідэнту. Я гэта вельмі цаню, — сказаў беларускі лідар.

Падрабязнасці — на сайце president.gov.by

Цяпер — на Віцебшчыне

Мноства шчырых сустрэч, яркіх экспазіцый, займальны квэст і грандыёзны канцэрт — рэспубліканская грамадска-культурная акцыя “Марафон адзінства” набывае ўсё большы размах. Якія мерапрыемствы разгорнуцца 29 і 30 лістапада ў Віцебску і куды праект адправіцца далей?



У праграме першага дня “Марафону адзінства” ў Віцебску — безліч цікавых выстаў, дзве з якіх створаны Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі. Гэта экспазіцыя “Кнігі ў дар Прэзідэнту”, што прысвечана выданням, падораным Кіраўніку дзяржавы буйнымі палітычнымі, грамадскімі і культурнымі дзеячамі, а таксама праект “Са знакам якасці”, у межах якога прадстаўлены збор рарытэтных плакатаў.

Віцябляне і госці горада ўбачаць і такія выставы, як “Стагоддзе беларускага кіно” Нацыянальнага гістарычнага музея і студыі “Беларусьфільм”, “Подзвігі і лёс партызан у дакументах” выдавецкага дома “Беларусь сёння”, многія іншыя.

Не абыдзецца без яркіх новаўвядзенняў. Упершыню ў рамках акцыі артысты Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь правядуць адразу два майстар-класы ў музычным каледжы імя І. Салярцінскага і школе мастацтваў імя А. Багатырова. Разгорнецца і новы праект “Маё жыццё. Мой шлях. Мой Прэзідэнт”, распачаты нядаўна ў Магілёве.

Наступны дзень “Марафону адзінства” абяцае быць такім жа насычаным. Так, у Віцебскай абласной бібліятэцы імя У. Леніна пройдзе цырымонія перадачы кніг і сертыфіката на падключэнне да электронных рэсурсаў Нацыянальнай бібліятэкі “Веды без меж”.

На канцэрце "Час выбраў нас" у Магілёве

Перад Палацам спорту пакажуць мабільную выставу Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, зладзяць гарадскі квэст “Гэта ўсё маё роднае”. Працягнуць працаваць і прадстаўленыя напярэдадні экспазіцыі.

Традыцыйна чакаецца “Знакавая сустрэча”, у якой на гэты раз паўдзельнічаюць старшыня Белтэлерадыёкампаніі Іван Эйсмант, генеральны дырэктар БелТА Ірына Акуловіч і галоўны рэдактар “Альфа Радыё” Вадзім Шэпет. “Крыніцы інфармацыі: каму давяраць?” — тэма размовы ў Віцебску. Фінальным акордам святочнай праграмы стане канцэрт “Час выбраў нас”.

Нагадаем, што старт рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі 17 верасня даў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. “Марафон адзінства” ўжо ахапіў гарады Мінскай, Гомельскай, Брэсцкай, Магілёўскай абласцей. Пасля Віцебска праект завітае ў Оршу.

Пад увагай Першага

Стары замак у Гродне, закладзены яшчэ ў XI стагоддзі, — сапраўдная візітоўка горада.

У пачатку XII стагоддзя тут былі ўзведзены княжацкі церам, Ніжняя і Верхняя цэрквы, іншыя жылыя і гаспадарчыя пабудовы, фрагменты якіх захаваліся да нашых дзён. Зараз у сценах замка размяшчаецца Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей.

Рэстаўрацыя помніка архітэктуры пачалася ў 2017-м. Тады аднаўлялі ўязную і сярэднюю вежы, мур з галерэяй, мерную хату і камяніцу. Першы пускавы комплекс Старога замка адкрыўся ў лістападзе 2021 года. Наведвальнікі ўбачылі нядаўна створаную музейную экспазіцыю, у якой і сёння прэзентаваны гісторыя будаўніцтва цвярдыні, ранейшае жыццё горада, эпоха караля Стэфана Баторыя ды іншыя старонкі мінулага. У пачатку 2023-га сустрэлі першых гасцей тры новыя інтэр’ерныя залы XVI стагоддзя. Адчынілі дзверы капліца, лазня, пакоі чыноўніка.

Другая чарга рэстаўрацыі Старога замка закранае корпус колішняга каралеўскага палаца, узведзенага напрыканцы XVI стагоддзя пры Стэфане Баторыю. Таксама будынак уключае фрагменты сцяны і гатычнай вежы каменнага палаца, які з’явіўся ў перыяд уладарання вялікага князя літоўскага Вітаўта ў XV стагоддзі.

У рамках падрыхтоўкі да аднаўлення каралеўскага палаца было выканана 3D-сканіраванне. Яно дазволіла істотна ўдакладніць інфармацыю, якая ўплывае на прыняцце гістарычна абгрунтаваных рашэнняў па рэстаўрацыі. Па выніках гэтых работ ажыццяўляліся зандажы, каб высветліць асаблівасці канструкцыі, таўшчыню, трываласць муроў і падлогі, месцы знаходжання цаглянай кладкі розных эпох. На першым паверсе былі раскрыты рэшткі фундамента XV стагоддзя, фрагменты сцяны і гатычнай вежы каменнага палаца часоў Вітаўта. Адроджаны каралеўскі палац зможа даць шматлікім наведвальнікам уяўленне пра багацце і разнастайнасць свайго шляху.

У адзінстве — сіла

Урачысты старт рэспубліканскай акцыі “За Беларусь адзіную!” адбыўся 25 лістапада ў Талачыне.

На мерапрыемстве прысутнічалі генеральны дырэктар Цэнтра культуры “Віцебск”, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Глеб Лапіцкі, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір Бабічаў, ганаровы грамадзянін Талачынскага раёна Аляксандр Марэйка. Спікеры звярнуліся з прывітальнымі словамі да ўдзельнікаў акцыі і адказалі на пытанні залы.

Пасля дыялогавай пляцоўкі гледачоў чакала насычаная канцэртная праграма. Зорнай госцяй стала Наталля Тамела — заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь, салістка Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра імя М. Фінберга. Свае нумары таксама прадставілі мясцовыя таленты: узорны харэаграфічны калектыў “Каханачка”, народны вакальны ансамбль “Явар”, народны вакальны ансамбль песні і музыкі “Александрына”.

— Акцыя “За Беларусь адзіную!” пацвярджае адзінства народа. У рамках праекта мы не толькі захапляемся выступленнямі таленавітых артыстаў, але і абмяркоўваем палітычныя, сацыяльныя працэсы, якія павінны згуртаваць беларусаў, каб наша грамадства ішло па шляху развіцця і стварэння, — падкрэсліў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір Бабічаў.

Назаўтра мерапрыемствы ахапілі ўстановы культуры Століна, Навагрудка і Смаргоні, 28 лістапада адбыліся ў Лагойску. Усяго ў рамках праекта айчынныя дзеячы культуры і мастацтва наведаюць 30 рэгіёнаў па ўсёй рэспубліцы.

Сярод галоўных мэт акцыі — умацаванне адзінства беларускага народа і падтрымка яго культурнай ідэнтычнасці. Арганізатарам выступае Маладзёжны тэатр эстрады пры садзейнічанні Міністэрства культуры і абласных выканаўчых камітэтаў.

Узнагарода за шчырасць

Беларусь, Кітай, Расія — XXIX Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі падвёў вынікі. Найлепшых танцораў назвалі ў Віцебску 24 лістапада.

Юбілейны форум стаў сапраўды багатым на імпрэзы: выступленні вядомых танцавальных аб’яднанняў, майстар-класы, экспазіцыі, творчыя сустрэчы. Акрамя насычанай канцэртнай і асветніцкай праграмы, увагу гледачоў прыцягнула цэнтральная падзея IFMC — конкурс сучаснай харэаграфіі. Пасля закрытых тураў у фінал патрапілі 13 калектываў з Беларусі, Кітая і Расіі. Вынікі спаборніцтва падвялі ў канцэртнай зале “Віцебск” у апошні фестывальны дзень. Пераможцаў і лаўрэатаў вызначыла журы, у склад якога ўвайшлі харэографы з Беларусі, Іспаніі, Расіі, Сербіі і са Швецыі.

Галоўны прыз атрымаў Ю Цзяцзюн з Кітая: удзельнік тэатра песні і танца горада Усі прэзентаваў нумар “Выгравіраванае дыханне”. Першую прэмію заваяваў заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны харэаграфічны ансамбль “Алеся” дзякуючы рабоце “Створым свет”. Другой прэміі ўдастоены лабараторыя эстраднага танца Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў за пастаноўку “Месца пад сонцам” і самарская танцавальная кампанія “Рака” за нумар “Латарэя адказнасці”. Трэцюю прэмію падзялілі праект Ганны Канстанцінавай (твор Hands down), які прадстаўляў Віцебск, і вучэбны ансамбль сучаснага танца “Акадэмія” з Цюмені (“Моўчкі гаварыць”).

Знайшлі сваіх уладальнікаў і спецыяльныя прызы. Прэміяй імя Яўгена Панфілава найлепшаму харэографу конкурсу ўжо другі раз уганараваны кіраўнік гомельскага праекта “Х-перЫменты” Валянцін Ісакаў. Узнагароду за глыбіню і пачуццёвасць вобраза ўручылі пецярбуржцам — артыстам праекта Алены Лісной (работа Every thing to recall). Прэмію за канцэптуальнасць мастацкага выказвання атрымаў танцавальны праект “Маяк” (нумар “Без вестак”) — таксама з Санкт-Пецярбурга.

Пасля ўзнагароджання лаўрэаты яшчэ раз паказалі свае пастаноўкі. Заключным акордам фестывалю быў спектакль “Прыгажосць” ад Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра і расійскага калектыву “Балет Яўгена Панфілава”.

Па старонках календара

■ **30 лістапада** з’явілася на свет актрыса Галіна Аляксандраўна Арлова (1928—2021). Народная артыстка БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР. У 1948-м скончыла студыю Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Коласа і была залічана ў трупу гэтай установы. З 1959-га служыла ў тэатры імя Янкі Купалы.

■ **2 снежня** 1953 года — дзень нараджэння скульптара Аляксандра Міхайлавіча Фінскага. Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Працуе ў манументальнай і станковай скульптуры, пластыцы малых формаў, медальерным мастацтве. Сярод асноўных твораў — мемарыяльны комплекс “Красны Бераг”, помнік С. Полацкаму на яго радзіме, скульптурныя кампазіцыі для Вялікага тэатра Беларусі, знак “Нулявы кіламетр” на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску, мемарыял “Яма. Мінскае гета”.

■ **3 снежня** з’явіўся на свет жывапісец, педагог Уладзімір Паўлавіч Сухаверхаў (1908—1977). Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. Падчас Вялікай Айчыннай вайны жыў у вёсцы Беразянка (Пухавіцкі раён) і разам з мастачкай Соф’яй Лі дапамагаў партызанам і падпольшчыкам Мар’інай Горкі. Аўтар палотнаў у розных жанрах станковага жывапісу. Выкладаў у Мінскім мастацкім вучылішчы, у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. У 1954—1956 гадах — старшыня Саюза мастакоў БССР.

■ **5 снежня** нарадзіўся Уладзімір Сямёнавіч Мурахвер (1931—2017) — мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (мастацкае шкло). Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. У 1959—2000-м працаваў на заводзе “Нёман” у Бярозаўцы: узначальваў мастацкі аддзел, мастацка-эксперыментальную лабараторыю. Аўтар звыш тысячы вырабаў са шкла, большасць якіх укаранёна ў масавую вытворчасць. У вольны час займаўся жывапісам і графікай.

У цесным узаемадзеянні

Рэалізацыя праграм супрацоўніцтва паміж Міністэрствам культуры і Беларускай праваслаўнай царквой працягваецца. Вынікі сумеснай работы і планы на 2025 год абмяркоўваліся ў Нацыянальным мастацкім музеі.

Старт урачыстай сустрэчы ў дзень праваслаўнага свята іконы Божай Маці "Скорапаслушніца" даў міністр культуры Рэспублікі Беларусь. **Анатолій Маркевіч** пазітыўна ацаніў плён супольных ініцыятыў:

— Дзякуючы рэалізацыі праграм супрацоўніцтва Міністэрствам культуры і Беларускай праваслаўнай царквой закладзены трывалыя асновы ўзаемадзеяння па ўсіх напрамках — ад адраджэння старадаўніх храмаў і манастыроў да ажыццяўлення сумесных культурных і адукацыйных праектаў.

Зладжанымі намаганнямі БПЦ і Міністэрства культуры, як адзначыў кіраўнік ведамства, удалося ўзнавіць такія святыні, як Крыж Еўфрасінні Полацкай і Тураўскі крыж, а таксама натхніць сучасных айчынных творцаў. Як вынік — мноства цікавых работ. Гэта, напрыклад, спектаклі "Гур'янаў" Маладзёжнага тэатра эстрады, "Ідыёт" тэатра імя Горкага, "Еўфрасіння. Святыя літары" Брэсцкага тэатра лялек, новы фільм "Прыстанак святой Еўфрасінні", прэм'ера якога адбудзецца ў 2025-м.

Сумесна з Беларускай праваслаўнай царквой праведзены шэраг фестываляў традыцыйнай і духоўнай культуры, форум "Пакроўскія сустрэчы ў Полацку", міжнародны пленэр "Святасць зямлі беларускай" і экспазіцыя па яго выніках, мерапрыемствы ў рамках Дня праваслаўнай кнігі, Дня славянскага пісьменства, Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх і Калядных чытанняў, рэспубліканскі конкурс "Бібліятэка — цэнтр духоўнай асветы і выхавання". Музеі, у сваю чаргу, арганізавалі выставачныя і адукацыйныя праекты, прысвечаныя юбілеям у гісторыі Царквы, культавай архітэктуры Беларусі, а таксама царкоўным прадметам.

— Упэўнены, што работа па рэалізацыі намечаных планаў і культурных праектаў будзе весціся ў цесным узаемадзеянні з нашай дзяржавай і на яе карысць, — сказаў Анатолій Маркевіч у завяршэнне прамовы.

> Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін быў узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь за значны ўклад у захаванне нацыянальнай культуры.

Духоўны лідар назваў яе адным з самых магутных інструментаў фарміравання сістэмы каштоўнасцей і ідэалаў, светапогляду.

— Наступствы выбару, зробленага выхаваным у пэўным культурным асяроддзі чалавекам, аказваюць глыбокі ўплыў як на саму асобу, так і на ўсё грамадства, — лічыць Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі **Веніямін**.

Звярнуўся да ўдзельнікаў сустрэчы і ўпаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь **Аляксандр Румак**. Ён падкрэсліў ролю дыялогу Царквы і ўстаноў культуры ў захаванні значных для грамадства каштоўнасцей.

Заключным этапам сустрэчы было абмеркаванне агучаных прадстаўнікамі БПЦ і дзяржаўных ведамстваў праектаў і ініцыятыў, а таксама іншых актуальных пытанняў узаемадзеяння.

Віялета ГРЫНКЕВІЧ
Фота з сайта Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

Дыялог праз духоўнае

Х Беларускія адукацыйныя Калядныя чытанні стартавалі ў Мінску 28 лістапада. Яны прысвечаны 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і 25-годдзю Саюзнай дзяржавы.

Калядныя чытанні — значны навукова-практычны форум, што праводзіцца Беларускай праваслаўнай царквой пры падтрымцы дзяржаўных ведамстваў, сярод якіх і Міністэрства культуры. Традыцыйна праграма ўключае мерапрыемствы разнастайных фарматаў — ад канферэнцый і секцыйных пасяджэнняў да экспазіцый і круглых сталоў. Сярод удзельнікаў — святары, прадстаўнікі органаў улады, дзеячы культуры, вучоныя, кіраўнікі і выкладчыкі ўстаноў адукацыі ды нядзельных школ, медыцынскія і сацыяльныя работнікі, студэнты.

Кожны форум адрозніваецца асноўнай тэмай. Так, сёлетнія Калядныя чытанні атрымалі назву "80-годдзе Вялікай Перамогі: памяць і духоўны вопыт пакаленняў. Да 25-годдзя Саюзнай дзяржавы".

— У тэмы выключна актуальны характар, — падкрэсліў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі **Веніямін**. — Прайшло 80 гадоў з завяршэння Вялікай Айчыннай вайны, і нам важна не толькі асэнсаваць прычыны самага крывавага канфлікту ў гісторыі чалавецтва, але і ў святле тых падзей паглядзець на сучасную сітуацыю.

Што да 25-годдзя Саюзнай дзяржавы, выдатным прыкладам сёлетняга супрацоўніцтва Беларусі і Расіі, паводле слоў выканаўцы абавязкаў старшыні Сінадальнага інфармацыйнага аддзела БПЦ **Аляксандра Пальчэўскага**, сталі дакументальныя фільмы "Дзве Еўфрасінні. Радасць зямлі Рускай" і "За паству і Айчыну". Паказы прэм'ер адбыліся на XXX Мінскім міжнародным кінафестывалі "Лістапад".

— Гэта каштоўныя працы, якія раскрываюць уклад Царквы і яе значэнне ў жыцці грамадства. Фільмы створаны пры ўдзеле Беларускай праваслаўнай царквы, расійскіх кінематаграфістаў і тэлеканала "Спас", — сказаў Аляксандр Пальчэўскі.

Як адзначыў старшыня Сінадальнага аддзела БПЦ па супрацоўніцтве са свецкімі ўстановамі адукацыі протаіерэй **Фёдар Поўны**, год ад году форум дазваляе зверыць знешні і ўнутраны вектары жыцця грамадства з пазіцый духоўнасці. Гэта ўнікальная пляцоўка для абмену вопытам, абмеркавання актуальных праблем і пошуку канструктыўных рашэнняў.

— Падвядзём вынікі зробленага Царквой за 2024-ы і разглядзім надзённыя пытанні, — акрэсліў асноўныя задачы форуму Фёдар Поўны.

Калядныя чытанні будуць праходзіць да 21 снежня. Падрабязней з праграмай можна азнаёміцца на афіцыйным сайце Беларускай праваслаўнай царквы.

Праграма Х Беларускіх адукацыйных Калядных чытанняў

Жыровіцкі манастыр

Палац у Жылічах

Аднаўленне, захаванне, выкарыстанне

Стан работы па ахове аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны і ўключэнні аб'ектаў, якія не выкарыстоўваюцца, у гаспадарчы і турыстычны абарот разгледзелі 25 лістапада на пасяджэнні ў Міністэрстве культуры.

Як адзначыў міністр **Анатолій Маркевіч**, Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей налічвае 5685 пазіцый, на шэрагу аб'ектаў сёння адбываюцца рамонтна-рэстаўрацыйныя работы. Разам з тым варта заўважыць, што 237 аб'ектаў знаходзяцца ў незадавальняючым стане і ўключаны ў план на 2023—2025 гады па захаванні аб'ектаў, якія не выкарыстоўваюцца.

З мэтай скарачэння колькасці такіх аб'ектаў усімі абласнымі выканаўчымі камітэтамі і Мінскім гарвыканкамам распрацаваныя і ўзгодненыя пакрокавыя планы дзеянняў да 2025 года, накіраваныя на захаванне помнікаў архітэктуры, у тым ліху шляхам уключэння аб'ектаў, якія не выкарыстоўваюцца, у гаспадарчы і турыстычны абарот. У адпаведнасці з зацверджанымі дакументамі да канца 2025-га неабходна ўключыць у гаспадарчы абарот 49 аб'ектаў, а ў турыстычны — 52. Станам на 1 лістапада 2024 года ў гаспадарчы абарот уключана 15 аб'ектаў, у турыстычны — 28. Аналіз паказаў недастатковасць тэмпаў работы ў гэтым напрамку. Прытым заканадаўствам спрошчаны парадак работ, прадастаўленыя падатковыя льготы, спрошчаныя працэдуры дзяржаўнай рэгістрацыі і правядзення аўкцыёнаў для аб'ектаў гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Падчас пасяджэння былі разгледжаны пытанні арганізацыі работы па размяшчэнні інвестыцыйных прапаноў на сайтах камітэтаў дзяржаўнай маёмасці абласных выканаўчых камітэтаў, а таксама выкананне мэтавага паказчыка Дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" па колькасці складзеных дасье на аб'екты спадчыны і нематэрыяльныя праяўленні творчасці чалавека, распрацаваных і прадстаўленых у ЮНЕСКА.

НОВЫЯ МАРШРУТЫ

З асноўным дакладам выступіла начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры **Ірына Дашчынская**, якая падкрэсліла, што сёння рамонтна-рэстаўрацыйныя работы вядуцца на такіх аб'ектах, як Спаса-Праабражэнская царква XII стагоддзя ў Полацку, касцёл Божага Цела XVI стагоддзя ў Нясвіжы, Навагрудскі замак XIII стагоддзя, будынак ешывы XIX стагоддзя ў Валожыне, замак XIV стагоддзя ў Крэве Смаргонскага раёна, палацава-паркавы ансамбль XVIII—XIX стагоддзяў у Жылічах Кіраўскага раёна, палацавы комплекс XVIII—XIX стагоддзяў у Ружанах Пружанскага раёна, будынак Клімавіцкага краязнаўчага музея, а таксама шэраг аб'ектаў Свята-Успенскага Жыровіцкага манастыра ў Слонімскім раёне. На мерапрыемствы па рэалізацыі планаў для работы з аб'ектамі гісторыка-культурнай каштоўнасці, якія не выкарыстоўваюцца, на 2024 год было выдаткавана каля 26 мільёнаў рублёў.

Сёння ў турыстычныя маршруты ўключана больш за 2170 аб'ектаў гісторыка-культурнай каштоўнасці. Варта адзначыць распрацаваныя сёлета турыстычныя маршруты па Мінску, Ваўкавыску, Нароўлі і Чачэрску. У Нацыянальным агенцтве па турызме за 10 месяцаў 2024 года прайшлі атэстацыю ў якасці гідаў-экскурсаводаў 46 супрацоўнікаў мінскіх музеяў, і плануецца, што да канца года пройдуць яшчэ шасцёра.

ПАВЫСІЦЬ ТЭМПЫ

Адным з важных аспектаў сістэмнага падыходу пры рабоце з аб'ектамі гісторыка-культурнай каштоўнасці з'яўляюцца мерапрыемствы па распрацоўцы праектаў іх зон аховы, што спрыяе выяўленню, аднаўленню, захаванню і выкарыстанню помнікаў гісторыі і культуры, а таксама ўключэнню аб'ектаў культурнай спадчыны ў гаспадарчы і турыстычны абарот. Праекты зон аховы размяшчаюцца ў адкрытым доступе і дазваляюць інвестарам, зацікаўленым у набыцці аб'ектаў гісторыка-культурнай каштоўнасці, ацаніць эканамічныя рызыкі і выгады, пралічыць акупальнасць. У адпаведнасці з планамі на 2022—2024 гады прадугледжаная распрацоўка 89 праектаў зон аховы, з якіх распрацавана 59, а таксама на разглядзе ў Міністэрстве культуры знаходзяцца сем, таму неабходна рэкамендаваць абласным выканаўчым камітэтам і Мінскаму гарадскому выканаўчаму камітэту ліквідаваць адставанне ад планаў.

Замак у Крэве

Навагрудскі замак

Важным аспектам з'яўляецца павелічэнне прысутнасці беларускіх аб'ектаў у спісах сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, што спрыяе павышэнню прэстыжу Рэспублікі Беларусь на міжнароднай арэне. У 2023-м у ЮНЕСКА накіраваныя дасье па намінацыях "Беларускае мастацтва выцінанкі" і "Неглюбская народная тэкстыльная традыцыя", у 2024-м накіраванае дасье "Культура беларускай дуды". Таксама сёлета ўключаны ў папярэдні спіс ЮНЕСКА Мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой". Сёння існуе прапанова аб стварэнні на базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі аддзела, які будзе рыхтаваць адпаведныя дасье для намінацыі ў спісы ЮНЕСКА.

З дапамогай сродкаў відэасувязі ў пасяджэнні ўзялі ўдзел кіраўнікі і супрацоўнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў і Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, якім было ўказана на неабходнасць актывізацыі работы па абмеркаваных кірунках і ліквідацыі адставання.

Антон РУДАК



Фрэскі Спаса-Праабражэнскай царквы ў Полацку

Памнажаючы традыцыі сяброўства

Дні культуры Беларусі з поспехам прайшлі ў Таджыкістане. Насычаная праграма выклікала вялікую цікавасць у шматлікіх удзельнікаў і гасцей мерапрыемстваў.

СУПРАЦОЎНІЦТВА ПАШЫРАЕЦЦА

Плённа прайшла сустрэча першага намесніка міністра культуры Рэспублікі Беларусь Валерыя Грамады з міністрам культуры Рэспублікі Таджыкістан Матлубахон Аманзода Сатарыён. Да дыялогу таксама далучыліся прадстаўнікі сферы культуры абедзвюх краін.

— Культурна-гуманітарнае супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Таджыкістан і Рэспублікай Беларусь паступальна пашыраецца. Па-іншаму і не можа быць: кіраўнікоў нашых дзяржаў Аляксандра Лукашэнку і Эмамалі Рахмона звязвае шматгадовае сяброўства, а нашы краіны — стратэгічнае партнёрства, — падкрэсліў Валерый Грамада. Ён таксама адзначыў, што абменныя Дні культуры — адна з самых яркіх форм культурнага супрацоўніцтва, і падобныя мерапрыемствы праводзяцца паміж нашымі краінамі рэгулярна.

Беларусь надае вялікае значэнне супрацоўніцтву паміж установамі адукацыі ў сферы культуры. Дзейнічаюць дагаворы паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў і Расійска-Таджыкскім універсітэтам, Таджыкскім дзяржаўным інстытутам культуры і мастацтваў імя Мірзо Турсун-задэ. Нашы студэнты паспяхова ўдзельнічалі ў культурных мерапрыемствах, якія праходзілі ў Душанбэ.

Ажыццяўляецца ўзаемадзеянне паміж тэатрамі, канцэртнымі арганізацыямі. Пагадненні аб супрацоўніцтве з Нацыянальнай бібліятэкай Таджыкістана і дзяржаўнай патэнтна-тэхнічнай бібліятэкай Рэспублікі Таджыкістан мае Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

Зацікаўленасць у актывізацыі існуючага ўзаемадзеяння выказваюць іншыя ўстановы культуры. Чарговым крокам у гэтым напрамку падчас Дзён культуры ў Душанбэ стала падпісанне мемарандума аб супрацоўніцтве паміж Беларускай дзяржаўнай філармоніяй і Дзяржаўнай філармоніяй Таджыкістана імя Акашарыфа Джураева.

ЦІКАВАСЦЬ ПРАЗ КІНО

У Душанбэ таксама прайшлі Дні беларускага кіно. Выступаючы на цырымоніі ўрачыстага адкрыцця, першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Валерый Грамада адзначыў, што наша краіна разглядае Таджыкістан у якасці значнага партнёра, уплыў якога на міжнароднай арэне пастаянна расце. Пашырэнне дзелавых і гуманітарных кантактаў паміж нашымі дзяржавамі працягваецца.

— Беларускія гледачы з цікавасцю адкрываюць для сябе сучасны таджыкскі кінематограф падчас Мінскага міжнароднага кінафестывалю “Лістапад”. Фільмы таджыкскіх рэжысёраў збіраюць поўныя залы і заваёўваюць фестывальныя ўзнагароды. Для нас вялікі гонар прадставіць таджыкскім гледачам беларускія фільмы, і мы шчыра спадзяёмся, што такія мерапрыемствы паспрыяюць умацаванню дружбы, супрацоўніцтва і ўзаемаразумення паміж нашымі народамі, — падкрэсліў Валерый Грамада.

Паказы адкрыла стужка Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм” “Чорны замак”. Таксама гледачы ўбачылі неіграві фільм “Мара чэмпіёна” і анімацыйную карціну “Песня Сірын”.

ВЫСТАВА АБ’ЯДНАЛА ЛЁСЫ

У рамках Дзён культуры ў Душанбэ адкрылася літаратурна-дакументальная выстава “Крывёю сэрца”, якую арганізавалі Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры і Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Назву экспазіцыя атрымала ад аднайменнага зборніка вершаў беларускіх паэтаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

На аснове фондавых матэрыялаў былі прадстаўлены гісторыі ваенных лёсаў ураджэнцаў Таджыкістана: удзельнікаў партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі, франтавікоў, якія ўдзельнічалі ў вызваленні нашай рэспублікі ў 1944-м, ваеннапалонных, якія загінулі на тэрыторыі Беларусі ў Шталагу 352, чые імёны занесены ў кнігу “Вечная памяць вам, сыны савецкага народа”.

ДЗЕЛЯ МІРУ І ЗГОДЫ

Урачыстае адкрыццё Дзён беларускай культуры і гала-канцэрт майстроў мастацтваў нашай краіны прайшлі ў Таджыкскім дзяржаўным акадэмічным тэатры оперы і балета імя Садрыдзіна Айні. У прывітальнай прамове першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Валерый Грамада адзначыў, што культура — адзін з асноўных фактараў умацавання дружбы паміж народамі. Насуперак усім складанасцям сучаснага жыцця, мастацтва здольнае напаўняць нашу рэчаіснасць асаблівым святлом і цяплом, захоўваць і памнажаць добрыя традыцыі сяброўскіх адносін, садзейнічаць захаванню міру і згоды.

— У год 80-й гадавіны вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і напярэдадні 80-годдзя перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне беларусы з удзячнасцю ўспамінаюць імёны герояў, якія аддалі жыцці пры вызваленні Беларусі. Сярод іх шмат ураджэнцаў брацкага Таджыкістана. Наша агульная памяць значная не толькі для сучаснасці, але і для будучыні народаў Беларусі і Таджыкістана, — у прыватнасці сказаў Валерый Грамада.

У гала-канцэрце ўдзельнічалі заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь Дзяржаўны акадэмічны ансамбль танца Беларусі, Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча, заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь вакальная група “Чысты голас”, салісты Вялікага тэатра Беларусі і Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля “Харошкі”, дуэт баяністаў “Неба саўнд”.

Заключным мерапрыемствам Дзён культуры стаў канцэрт майстроў мастацтваў Беларусі ў старажытным горадзе Гісары. Гледачы сустрэлі нашых артыстаў з асаблівай усходняй гасціннасцю. Апладысменты ўдзячнай публікі доўга не сціхалі пасля кожнага нумара.

Святлана ЧЭКАЛАВА
Фота з Telegram-канала Міністэрства культуры

Падчас гала-канцэрта ў Таджыкскім дзяржаўным акадэмічным тэатры оперы і балета імя Садрыдзіна Айні

У музеі-запаведніку “Казанскі Крэмль” працуе выстава пра Нясвіжскі замак.

Сто прыступак музыкі

Аляксей Снітко

Мінскі дзяржаўны музычны каледж імя М. Глінкі 29 лістапада ўрачыста святкуе векавы юбілей. Адмысловы гранд-канцэрт пройдзе ў рамках 50-га фестывалю “Беларуская музычная восень” і будзе настолькі аб’ёмным, што пачатак прызначаны на дзве гадзіны раней, чым звычайна.

Напярэдадні падзеі мы паразмаўлялі з дырэктарам навучальнай установы, старшынёй вучэбна-метадычнага аб’яднання ў сферы сярэдняй спецыяльнай адукацыі на рэспубліканскім узроўні па спецыяльнасцях у галіне культуры, харавым дырыжорам, даследчыкам мастацтва **Аляксеем Снітко**.

— Аляксей Іванавіч, цягам года ладзілася безліч творчых праектаў да юбілею — не толькі ў каледжы, але і на іншых пляцоўках, уключаючы абедзве залы сталічнай філармоніі. У чым адметнасць цяперашняга гранд-канцэрта?

— Частку вечарыны зоймуць віншаванні, а галоўная ідэя імпрэзы — паказаць усе стрыжнёвыя напрамкі, па якіх развівалася падрыхтоўка спецыялістаў, тыя напрамкі, што сталі асновай беларускай нацыянальнай культуры. Найперш гэта акадэмічная сфера. Яна будзе прадстаўлена сімфанічным аркестрам і салістамі са спецыяльнасцей “Фартэпіяна”, “Струнныя смычковыя інструменты”. Важны кірунак — народнае музычна-выканальніцкае мастацтва. Яго прэзентуюць хор “Бліскавіца”, зводны аркестр беларускіх і рускіх народных інструментаў. Эстрадны напрамак ахопіць класіку джаза, якую сыграе наш джаз-бэнд. Фінальныя харавыя кампазіцыі прадэманструюць адзінства ўсяго калектыву, педагогаў і навучэнцаў. Знакамітая “Спадчына” Ігара Лучанка на верш Янкі Купалы стане сімвалам сувязі пакаленняў, мінуўшчыны і сучаснасці, традыцый і наватарства.

— Ці можаце вылучыць самыя важныя вехі стагадовага шляху?

— Наш тэхнікум (так каледж называўся ў 1924-м) — адна з першых навучальных устаноў рэспублікі, што рыхтавалі прафесійныя музычныя кадры. Важны этап далейшага развіцця такой адукацыі — адкрыццё ў розныя гады падобных вучылішчаў па ўсёй краіне. Гэта было пашырэнне не толькі геаграфіі, але і агульнай жанравай панарамы музычнага мастацтва. Пры ўсім ахопе асноўных неабходных спецыяльнасцей музычныя вучылішчы, як іх тады называлі, часта мелі профіль, што адлюстроўваў мясцовыя асаблівасці, попыт. Нельга не адзначыць сярэдзіну 1970-х, калі мы атрымалі новы будынак, дзе знаходзімся і цяпер. Вядома, вехі развіцця — і прысваенне каледжу ў 1957-м імя рускага класіка Міхаіла Глінкі (дарэчы, ён быў родам са Смаленшчыны, меў беларускія карані), і шматлікія перайменаванні навучальнай установы, што адлюстроўвалі змены ў грамадстве. Да юбілею мы выдалі буклет, у якім апісваецца гісторыя і сучаснасць каледжа, асноўныя этапы яго шляху.

— У чым бачыце самыя яркія дасягненні ўстановы?

— У музыкантах, якіх мы ўзрасцілі. Тых, хто сфарміраваў і працягвае развіваць музычную культуру краіны, робіць унёсак у падрыхтоўку кадраў, у з’яўленне і выкананне новых твораў, што праз час становяцца беларускай класікай. Мы ганарымся мерапрыемствамі, якія ладзяцца на нашай базе. Гэта аж 10 конкурсаў: міжнародных, рэспубліканскіх, гарадскіх. Яны ахопліваюць самыя розныя музычныя спецыяльнасці. Да прыкладу, конкурс канцэртмайстарскага майстэрства імя В. Савіна, харавых і сольных спеваў “Вясновы спеў”, камерных ансамбляў “Струны Арфея”. Да юбілею спіс папоўніўся: увесну мы арганізавалі I Міжнародны конкурс выканальніцкага мастацтва імя М. Глінкі. На нашым рахунку — і дзясяткі адукацыйных праектаў: міжнародны “Да вяршынь творчасці”, Мінскае харавое свята “Спявай, мая сталіца” ды іншыя. Кожны год праводзім каля пяці такіх буйных мерапрыемстваў. Нашы навучэнцы і калектывы перамагаюць на замежных конкурсах і фестывалях, удзельнічаюць у самых значных дзяржаўных канцэртах, уключаючы тыя, што суправаджаюць уручэнне прэмій Прэзідэнта “За духоўнае адраджэнне”, ладзяцца да свят і памятных дат.

> “Сёння Мінскі дзяржаўны музычны каледж імя М. Глінкі ўпэўнена займае вядучыя пазіцыі сярод устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў сферы культуры. Каледж працягвае развівацца, рэалізоўваючы мноства творчых праектаў, беражліва захоўваючы і прымнажаючы традыцыі, уносіць важкі ўклад у выхаванне новага пакалення музыкантаў”.
>
> **Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатолій Маркевіч**

— Юбілей не падстава спыняцца?

— У 2025-м найважнейшая дата — 80-годдзе Перамогі. Мы рыхтуем міжнародны творчы праект “Зорка Вялікай Перамогі”. Гэта будзе маштабны канцэрт, зроблены сіламі таленавітай моладзі Беларусі і Расіі. Акрамя вядомых мелодый, прагучаць новыя кампазіцыі айчынных і расійскіх аўтараў. Падобныя праграмы спрыяюць патрыятычнаму выхаванню навучэнцаў, скіраваны на збяражэнне гістарычнай памяці і далучэнне моладзі да найлепшых узораў вакальна-сімфанічнай спадчыны. Зразумела, планы звязаны таксама з удасканальваннем музычнай адукацыі, далейшым павышэннем якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, адаптацыяй іх да свежых патрабаванняў інфармацыйнага грамадства, уменнем арыентавацца ў сучасных умовах, быць мабільным, гатовым і да інавацый, і да захавання найлепшых традыцый музычнай педагогікі, выканальніцтва, музыказнаўства. Вельмі важна, каб нашы выпускнікі падтрымлівалі ў сабе азарт, натхненне, імкнуліся пастаянна павышаць прафесійны ўзровень, заставаліся цікавымі для вучняў, слухачоў, гледачоў, пісалі творы, распрацоўвалі праекты, канцэртныя праграмы — іншымі словамі, працягвалі рабіць унёсак у музычнае жыццё краіны.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота з архіва каледжа

Сумеснае выступленне аркестраў беларускіх і рускіх народных інструментаў. Дырыжор — Сяргей Гладкі

Рэспубліканскі фестываль нацыянальнай драматургіі праходзіць у Бабруйску да 3 снежня.

“Багатая культурная і гістарычная спадчына Беларусі выклікае пачуццё гонару ў кожнага яе жыхара. Адным з унікальных помнікаў архітэктуры з'яўляецца палацава-паркавы ансамбль у Нясвіжы, які ўключаны ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Не аднойчы абнаўляўся ён пасля войнаў, пажараў і перыядаў забыцця. Дзякуючы рабоце рэстаўратараў, будаўнікоў і спецыялістаў музейнай справы сёння мы бачым Нясвіжскі замак ва ўсім яго хараство. Няхай і далей гэты выдатны твор айчыннага дойлідства застаецца ўвасабленнем культурнага багацця Беларусі, сімвалам невычэрпных стваральных сіл і здольнасцей нашага народа”.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА,
20 ліпеня 2012 г.

“Нясвіж”: гісторыя адраджэння

Сотні тысяч турыстаў штогод прыязджаюць у Нясвіж. Любуюцца архітэктурай замка і атрымліваюць асалоду ад прагулкі па дзівосным парку. Асцярожна шамацяць бахіламі па бліскучым паркеце палацавых залаў, зачаравана разглядаюць гіпсавую зорку на столі ды кафлі на камінах, дзівяцца на сервіроўку стала. Узіраюцца ў партрэты былых уладальнікаў, слухаюць легенду пра Чорную панну і шчыра абураюцца каварствам каралевы Боны. І, перапоўненыя ўражаннямі, наўрад ці задумваюцца, што аднаго з найпрыгажэйшых гісторыка-культурных комплексаў Беларусі магло б і не быць у тым шыкоўным выглядзе, у якім ён паўстае перад намі сёння.

Так Нясвіжскі палац выглядае цяпер

ПАДТРЫМКА І КАНТРОЛЬ

Як ішло адраджэнне Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка “Нясвіж”, што ўнесены ў Спіс аб'ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, распавёў даследчык, экскурсавод і летапісец рэстаўрацыі — старшы навуковы супрацоўнік музея-запаведніка **Сяргей Чысцякоў**.

— Палацава-паркавы ансамбль “Нясвіж” стаў першым у нашай краіне аб'ектам, дзе вялася такая маштабная рэстаўрацыя. І калі б не падтрымка дзяржавы — работы фінансаваліся за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва — і не пільная ўвага з боку Аляксандра Лукашэнкі, які даваў даручэнні і кантраляваў усе працэсы, створанае хараство так і засталося б проста марай, — заўважыў Сяргей Чысцякоў.

Па словах спецыяліста, знайсці адну арганізацыю, якая выканала б усе віды работ, не выпадала. Змянілася некалькі падрадчыкаў, якія займаліся будаўніцтвам. За інтэр'еры ўзялася “Белрэстаўрацыя”. Пры правядзенні работ выяўляліся моманты, якія вымушалі ўносіць змены і ў праект, і ў каштарыс. Хапала пытанняў і па выбары методык ды тэхналогій. У спрэчных і незразумелых сітуацыях на дапамогу прыходзіла спецыяльна створаная кансультатыўная рада. Часам залучалі рэстаўратараў з іншых краін, у прыватнасці з Расіі.

— За 2004—2012 гады было зроблена вельмі шмат. Калі пераглядаю фатаграфіі тых часоў і бачу цяперашні замак, разумею: пры жаданні і падтрымцы на самым высокім узроўні беларусы могуць зрабіць усё! — падкрэслівае Сяргей Уладзіміравіч.

Нясвіжская ратуша — помнік архітэктуры XVI–XVIII стст.

З ГЛЫБІНІ СТАГОДДЗЯЎ

Узнікненне ў Нясвіжы каменнага замка звязана з дзейнасцю Мікалая Хрыстафора Радзівіла Сіроткі.

— Афіцыйным днём заснавання Нясвіжскага замка прынята лічыць 7 мая 1583 года, аб чым сведчаць лічбы, выбітыя на пліце, якую знайшлі падчас рэстаўрацыі над парадным уваходам у палацавую частку. Але ёсць доказы таго, што гаспадарчы корпус разам з вежай з'явіліся да закладкі палаца, — здзівіў фактамі Сяргей Чысцякоў. — У гісторыі замка трэба вылучыць тры асноўныя этапы, калі яго архітэктура, інтэр'еры і тэрыторыя перажывалі найбольш радыкальныя змены. Першы з іх — рэканструкцыя ў сярэдзіне XVIII стагоддзя, пасля нашэсця шведаў. Другі — аднаўленне рэзідэнцыі роду Антоніем Вільгельмам і Марыяй дэ Кастэлян пасля працяглага запусцення замка, звязанага з наступствамі вайны 1812-га. Найбольш важны для нас трэці этап — рэстаўрацыя, праведзеная ў 2004—2012-х, калі падставай для маштабных работ стаў аварыйны стан пабудоў, а таксама неабходнасць размяшчэння ў замку сучаснага музейнага комплексу.

З 1945-га тут дзейнічаў санаторый “Нясвіж”, дзе адпачывалі паэты, пісьменнікі, мастакі. Але ўжо за савецкім часам аб'ект пачаў прыцягваць увагу і як архітэктурны шэдэўр. Да сярэдзіны 1980-х неабходнасць прыняцця дзейсных мер для захавання замка стала відавочнай, і для санаторыя вырашылі ўзвесці новы будынак.

Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік “Нясвіж” быў створаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у ліпені 1993 года. У склад увайшлі 10 аб'ектаў на тэрыторыі Нясвіжа, дамінантныя — замак Радзівілаў, гарадская ратуша з гандлёвымі радамі, Слуцкая брама, былы заезджы двор з карчмой... Асноўнай задачай музея-запаведніка стала злучэнне ўсіх помнікаў архітэктуры пад эгідай адной структуры, якая б займалася іх вывучэннем і захаваннем.

Далейшы лёс комплексу быў вызначаны распараджэннямі Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. У першым, №148 ад 22 жніўня 1995 г., гаварылася аб правядзенні даследчых работ у Нясвіжскім і Мірскім замках. Другое — №363рп ад 2 снежня 1997 г. — прадугледжвала паэтапную ліквідацыю санаторыя “Нясвіж” і абавязвала шэраг міністэрстваў далучыцца да рэстаўрацыі палацава-паркавага ансамбля. Асаблівую ролю ў лёсе замка адыграла і рэалізацыя Дзяржаўнай праграмы па адраджэнні культурнай і гістарычнай спадчыны на 2021-2025 гады “Культура Беларусі”.

Работы былі ўмоўна падзелены на два этапы. Першы пускавы комплекс уключаў у сябе рэстаўрацыю брамы з вежай і прыбрамных карпусоў, замену купала надбрамнай вежы. А 1 верасня 2008 года для наведвальнікаў адкрылі тры залы і выставачную галерэю.

Другі пускавы комплекс прадугледжваў рэканструкцыю і рэстаўрацыю палацавай часткі, дазорнай вежы, карпусоў Камяніцы і Арсенала, замкавай капліцы, падвальных памяшканняў. Работы завяршылі ў 2012-м: 20 ліпеня адбылося ўрачыстае адкрыццё галоўнага аб'екта Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка “Нясвіж” — музейнага комплексу ў замку князёў Радзівілаў з удзелам Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі.

Санаторый "Нясвіж" за савецкім часам

Палац князёў Радзівілаў да рэстаўрацыі 2012 года

ПАД НОВЫЯ МЭТЫ

— Апошні адпачывальнік пакінуў санаторый “Нясвіж” у 2001-м. Памяшканні дасталіся нам у нядрэнным стане, — вярнуўся да гісторыі рэстаўрацыі Сяргей Чысцякоў. — Але яны не адпавядалі новым задачам — размяшчэнню тут сур'ёзнага культурна-музейнага цэнтра з інфраструктурай. Напрыклад, цяперашні гатэль пры гаспадарчым двары замка ў часы СССР уяўляў сабой вода-грязелячэбніцу. А ў арыгінале будынак быў замкавай стайняй. Ва ўспамінах пісьменніка Уладзіміра Бранеўскага ад 1810-га гаворыцца: “Канюшня невялікая, коней на 50. Па цэнтры ідзе каланада пад чырвонае дрэва з разьбянымі капітэлямі. Вісяць дываны, люстэркі, карціны, стаіць мэбля ручной працы і накурана пахошчамі”.

Была праведзена рэканструкцыя, пабудаваны мансардны паверх — і цяпер гэта дастойны гасцінічны комплекс.

Гарадская ратуша Нясвіжа ўнікальная — найстаражытнейшая з тых, што захаваліся ў Беларусі, — 1596 года. Будынак магістрата, узведзены на сродкі і сіламі месцічаў, на працягу некалькіх стагоддзяў быў для членаў гарадской абшчыны галоўнай інстанцыяй для вырашэння надзённых пытанняў. Гравюра Томаша Макоўскага пачатку XVII стагоддзя сведчыць: на вежы былі гарадскі гадзіннік і назіральная пляцоўка.

Рэстаўрацыя ратушы вялася з 1997-га на працягу сямі гадоў. У выніку фасады набылі першапачатковае аблічча. Аднавілі і верхнія ярусы. Вежу зноў упрыгожыў гадзіннік, а інтэр'еры другога паверха рэканструявалі пад музейную экспазіцыю. У 2004-м ратуша стала функцыянаваць як асобнае падраздзяленне музея-запаведніка.

Малая сталовая зала палаца, 2024

БУДЫНАК БЕЗ ПАДМУРКА

Пачынаючы з 2001-га ў замку праводзіўся комплекс навукова-пошукавых, ірыгацыйных і зямельных работ, без якіх немагчыма і гаварыць пра гарманічнае спалучэнне архітэктурных аб'ектаў з навакольным ландшафтам. Пасля дакладнага абследавання пабудоў былі пачаты зандажы і археалагічныя пошукі. Высветлілася: стан замка крытычна незадавальняльны. Ён быў узведзены на штучна насыпным грунце, які мае тэндэнцыю да нераўнамернага асядання, што моцна шкодзіць цэласнасці апорных канструкцый.

У вельмі кепскім стане аказалася Усходняя галерэя. У архіўных дакументах ёсць згадка аб тым, што яна разбуралася нават падчас будаўніцтва. Даследаванні паказалі: будынак наогул не мае падмурка. Ён проста “прыклеены” з аднаго боку да палаца, з другога — да комплексу арсенала, а стаіць за кошт двухметровай таўшчыні знешніх сцен. Сцены ж, якія выходзяць у двор, былі ўсяго 75 см, і гэта для трохпавярховай канструкцыі стала вялікай небяспекай: яны пачалі адыходзіць ад асноўнай канструкцыі. З боку двара спатрэбілася ўстанавіць сістэму падпорак, каб сцены дачакаліся рэстаўрацыі.

— Мы хацелі захаваць як мага больш, — распавядае Сяргей Уладзіміравіч. — Таму спачатку знялі толькі верхні паверх галерэі. Але высветлілася, што пралічаных нагрузак будынак усё роўна не вытрымае. Тады разабралі другі паверх, спадзеючыся пакінуць хаця б першы. Аднак, прасвідраваўшы падмурак, выявілі пад ім велізарную тарфяную лінзу з будаўнічым смеццем, якое засталося пасля рэканструкцыі XVIII стагоддзя. У выніку на мяжы 2007—2008-х галерэю поўнасцю разабралі. Асновай для ізноў узведзенай у лістападзе 2008-га пабудовы паслужылі 1100 паляў.

Паўднёва-ўсходні фасад замка ў перыяд правядзення зандажных работ, якія пачаліся з 2001 года

НЕЧАКАНЫЯ АДКРЫЦЦІ

— Што да палацавай часткі цэнтральнага корпуса, там да пачатку рэканструкцыі ў нядрэнным стане захаваліся роспісы і плафон парадных усходаў, печы, аўтэнтычныя каміны. У пакоях княгіні рэстаўратары знайшлі фрагменты роспісу XVII стагоддзя. Выявілі і некалькі закладзеных дзвярэй, схаваныя печы і каміны — дарэчы, іх для ацяплення замка выкарыстоўвалася 186! — расказаў Сяргей Уладзіміравіч. — Цікавай у плане даследавання стала цяперашняя зала архіва і бібліятэкі. У часы санаторыя яна выкарыстоўвалася як кінатэатр. Калі мы знялі нахільную падлогу, убачылі ў практычна ідэальным стане арыгінальную плітку, датаваную 1892 годам. Такое ж неверагоднае адкрыццё чакала нас і ў сучаснай зале гісторыі будаўніцтва і рэстаўрацыі замка.

Спецыялісты доўга шукалі трохпавярховую замкавую капліцу. Аказалася, у бытнасць санаторыя яна была перакрытая на ўзроўні другога і трэцяга паверхаў, дзе размясціліся ленінскі пакой і палаты для адпачывальнікаў. Паўстала пытанне: ці вытрымаюць апорныя канструкцыі аднаўленне таго архітэктурнага аб'ёму, які існаваў першапачаткова? Нарэшце архітэктары сказалі, што з улікам сучасных матэрыялаў зрабіць гэта можна. І зрабілі! Цяпер госці наведваюць выдатны дзейны храм — дакладную копію таго, у якім калісьці бывалі каралі ды знакамітыя асобы.

— Колькі разоў Нясвіжскі замак знаходзіўся на краі поўнага разбурэння і гібелі! Але ўвесь час з дапамогай неабыякавых людзей ён адраджаўся. Упэўнены: і ў далейшым яго чакае доўгае цікавае жыццё, — падсумаваў Сяргей Чысцякоў.

Святлана ЧЭКАЛАВА
Фота аўтара і з архіва Сяргея ЧЫСЦЯКОВА

Устаноўка купала на надбрамную вежу, 2005

Рэстаўрацыя печы ў кабінеце князя, 2009

ПРЫГОЖЫ КУПАЛ

Любы феадальны замак вядомы дазорнай вежай. Была такая і ў Нясвіжскім. У 2005-м на ёй узвялі купал паводле гравюры Томаша Макоўскага. Дарэчы, такая выява ўпрыгожвала і беларускую сторублёвую купюру першага ўзору.

— Новы купал выклікаў спрэчкі сярод спецыялістаў. Бо ў часы Макоўскага збудаванне лічылася замкам і выконвала абарончую ролю. А цяпер мы маем палацавы комплекс з рэшткамі абарончых збудаванняў. І гэтая замкавая вежа з палацавай архітэктурай не спалучалася, — растлумачыў Сяргей Чысцякоў. — У выніку кансультацый вырашылі надаць купалу барочную форму, якую можна ўбачыць на пазнейшых малюнках і старых фатаграфіях. Новы купал устанавілі 14 красавіка 2012 года.

Фестываль-конкурс “Хорам яднаныя” пройдзе з 6 па 8 снежня ў музеі-запаведніку “Нясвіж”.

Выстава “Дарога да міру” адкрыецца сёння ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры.

Сон, маскі і антычнасць

"Дзядзечкаў сон" з'явіўся ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы — вядома, на беларускай мове, але ў пастаноўцы расійскага рэжысёра Дзмітрыя Акімава.

НЕ ПЕРШЫ ЗВАРОТ

Гэта не першы зварот тэатра да аповесці Ф. Дастаеўскага. Ды і ў Віцебску ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа летась паставілі аднайменны спектакль. Зразумела, цалкам іншы, бо інсцэніроўку і рэжысуру ажыццявіла знаная артыстка калектыву Ніна Обухава. А ў ролі Князя — народны артыст Беларусі Тадэвуш Кокштыс, які зрабіў свайго героя фігурай трагікамічнай. Невыпадкова менавіта гэты спектакль стаў яго бенефісам да 90-годдзя, што спраўлялася 31 кастрычніка. Як было пазначана на сайце тэатра да юбілею майстра, "Князь толькі робіць выгляд, што ён працягвае ўдзельнічаць у гэтым жыццёвым маскарадзе («знешнім сне»). Насамрэч у ім адбываецца змаганне паміж «знешнім» і «ўнутраным» чалавекам".

КЛАСІКА — ГЭТА НЕ НУДНА

Рэжысёр цяперашняй прэм'еры купалаўцаў Дзмітрый Акімаў рабіў уласную інсцэніроўку, адзначыўшы на прэс-канферэнцыі, што прытрымліваўся пазачасавай стылізацыі эпохі, каб актуалізаваць мінулае. Пры гэтым імкнуўся стварыць "лёгкі, вясёлы спектакль". І прапанаваў, як падкрэсліў артыст Барыс Цяцёркін, адзін з выканаўцаў ролі Мазглякова, "востры гратэскавы жанр, накіраваны на папулярызацыю класікі ў моладзі", на доказ таго, што "класіка — гэта не нудна, а неверагодна цікава за кошт формы і зместу".

Сапраўды, цікавага ды смешнага ў пастаноўцы хапае. Гледача ўвесь час прывабліваюць інтэрактывам — праходамі-прабежкамі артыстаў праз залу. Задзейнічаны і механізм пад'ёму іх на сцэну на спецыяльнай платформе, што не можа не прыцягнуць увагу. Смех выклікаюць дададзеныя ў спектакль адразу пяцёра Грышкаў-сялян, а таксама феі, іспанцы як візуалізаваныя мары дзейных асоб.

ЦАРЭЎНА, Д'ЯБАЛ ДЫ...

Зіна (Ганна Мешчаракова) спачатку паўстае гэткай ідэалістычна казачнай царэўнай у какошніку. Ва ўсім белым, бы анёлак. Са змярцвелым тварам, бы жывая нябожчыца. З непрыемна рэзкімі ноткамі ў голасе, што павінны перадаць яе непрыняцце атачэння. А пагадзіўшыся на прапанову маці ўзяць шлюб з Князем, гераіня ператвараецца ў ляльку — і па сцэнічным строі (кароткая сукенка, банцік на галаве), і па механічнасці рухаў, манеры гаварыць.

Адрынуты Зінін жаніх Мазглякоў у выкананні Сяргея Бірульчыка нагадвае спакушальніка Мефістофеля: д'ябла ў чалавечым абліччы выдаюць то спапяляльныя позіркі-бліскавіцы, напрацаваныя артыстам у некаторых ранейшых ролях, то непрыдатная для рэальнасці пластыка (харэограф — Кірыл Балтрукоў).

А вось Мар'я Аляксандраўна Маскалёва, якую звычайна малююць мясцовай фурыяй, што адстойвае сваё першынство, бы ў бойках без правілаў, наадварот, становіцца цэнтральнай трагічнай фігурай. Мастацкі кіраўнік тэатра, заслужаная артыстка Беларусі Вольга Няфёдава ўкладае ў гэтую ролю безліч супрацьлеглых адценняў. Яна ледзь не адзіная ў гэтым спектаклі, хто выдатна спалучае ўладарныя грымоты з тэатральным шэптам, добра чутным у любым кутку залы. Яе гераіня папраўдзе дбае пра шчаслівую, па яе мерках, будучыню для адзінай дачкі Зіны. І скарыстоўвае для гэтага ўсе магчымыя і немагчымыя метады — ад жорсткага ўціску да вяршынь дыпламатыі, хітрыкаў, прыхаваных ласкавай, пяшчотнай спагадай. Невыпадкова яе муж Афанасій Мацвеевіч (Аляксандр Пашкевіч) не толькі баіцца яе, але і відавочна кахае, бо прымае яе менавіта такую, якая яна ёсць, ва ўсёй паўнаце несумяшчальных, здавалася б, рысаў.

Князя выдатна іграе Сяргей Шырочын. А ў хуткім часе у гэтай ролі выйдзе народны артыст Беларусі Генадзь Аўсяннікаў. І гэта будзе іншае прачытанне!

ВЕНЕРА ЦІ ФЕМІДА

Ды ўсё ж галоўнай дзейнай асобай цяперашняй прэм'еры становіцца... натоўп, абываццелі-плеткары горада Мардасава. Усе ў аднолькавым чорным, бы зграя крумкачоў, яны заўжды ў прадчуванні новай ахвяры. І з'яўляюцца ў колькасці дванаццаці чалавек, хаця тыя ці іншыя асобы ў гэтым складзе змяняюцца. Лічба невыпадковая: менавіта столькі ўдзельнікаў было ў хоры антычных трагедый, каб сімвалізаваць аб'ектыўны пачатак. Спектакль уступае ў дыялог з традыцыямі антычнасці. Невыпадкова ў сцэнаграфіі (мастак-пастаноўшчык — Аляксандр Камянец), на афішы і ў праграмках скарыстана статуя Венеры. Праўда, у некаторых выпадках яе твар нагадвае Феміду, толькі замест павязкі на вачах — цёмна-зялёная маска для сну.

Гэты аксэсуар атрымалі і журналісты, патрапіўшы на прэс-канферэнцыю. Бо маска непасрэдна звязана з назвай, эстэтыкай, зместам, меседжам спектакля: маўляў, найлепшая багіня правасуддзя — сумленне як катэгорыя Бога ўнутры нас.

ВЫКЛІК ПРЫНЯТЫ

Працавалася рэжысёру добра: ён паспеў пазнаёміцца з трупай яшчэ летась, калі ставіў "А зоры тут ціхія...". Ды і творчасць Ф. Дастаеўскага яму вельмі блізкая: пачынаючы з гадоў навучання, ён двойчы з розных пунктаў гледжання ставіў "Братоў Карамазавых", таксама "Бесаў", "Злачынства і пакаранне", спектаклі неадночы атрымлівалі ўзнагароды. А ў "Ідыёце" іграў і сам як акцёр. Таму за выклік успрыняў прапанову звярнуцца да іранічных старонак творчасці рускага пісьменніка з беларускімі каранямі (як вядома, род Дастаеўскіх паходзіць з вёскі Дастоева на Брэстчыне). Пераклад зрабіў Алесь Вольскі з БТ-3. І расійскі пастаноўшчык настолькі прызвычаіўся да беларускай мовы, што на ёй, як сам прызнаўся, стаў працаваць яго мозг.

Ну а наступнай прэм'ерай купалаўцаў, як засведчыў генеральны дырэктар тэатра Аляксандр Шастакоў, стане "Брама неўміручасці" Кандрата Крапівы.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота БЕЛТА

XIV Мінскі міжнародны Калядны оперны форум пачнецца 10 снежня ў Вялікім тэатры Беларусі.

Зачараваць светам кнігі

Чым у эпоху інфармацыйных тэхналогій завабіць падрастаючае пакаленне? Як далучыць да бібліятэчнага жыцця маладога чытача? Пытанні, якімі сёння задаюцца работнікі кніжных скарбніц, разглядаліся падчас канферэнцыі "Роля дзіцячых бібліятэк у захаванні культурнай спадчыны і папулярызацыі чытання ў юнацкім асяроддзі".

Размова праходзіла 21 лістапада ў Мінску. Адмыслоўцы сабраліся ў Доме прэсы, каб падзяліліцца досведам паспяховых праектаў, накіраваных на стварэнне шчырага дыялогу з дзіцячай аўдыторыяй.

ДА ПРЫКЛАДУ, У СТАЛІЦЫ

Сістэма дзіцячых бібліятэк Мінска ўключае 18 устаноў. Флагман — Цэнтральная дзіцячая бібліятэка імя М. Астроўскага, што сёлета адзначыла стагадовы юбілей. З першага дня заснавання яна грае важную ролю ў выхаванні моладзі, развіцці чытацкіх навыкаў і творчага мыслення. Штогод кніжную скарбніцу наведваюць больш за 18 тысяч чалавек, а яе фонд складае каля 113 тысяч выданняў.

— Дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы рэалізуем шмат магчымасцей для дадатковай адукацыі, арганізуем культурна-асветніцкія і забаўляльныя мерапрыемствы — расказала дырэктар Таццяна Швед. — Рэгулярна ствараем новыя курсы, цыклы лекцый, інтэрактыўныя экспазіцыі. Праводзіцца індывідуальная работа з наведвальнікамі, вялікая ўвага надаецца сямейнаму чытанню.

Асабліва насычаным з пункту гледжання праектнай дзейнасці, паводле слоў кіраўніцы, атрымаўся гэты год. Так, з лютага па кастрычнік ва ўстанове разгарнулася акцыя "Мая бібліятэчная гісторыя", удзельнікі якой дзяліліся асабістымі цёплымі ўспамінамі аб юбіляры.

Папулярнасць у аўдыторыі набылі "Бібліяпрыцемкі-2024" — вячэрнія сустрэчы з дзіцячымі пісьменнікамі Ірынай Токаравай, Кацярынай Хадасевіч-Лісавой, Паўлам Гушынцам, якія ладзілі тэатралізаваныя чытанні, майстар-класы, літаратурныя віктарыны, настольныя гульні. Выступленні слынных аўтараў праходзілі і ў рамках праекта "Бібліятэка пад адкрытым небам".

— Усе ініцыятывы прасоўваем праз інтэрнэт-рэсурсы, у прыватнасці праз сацыяльныя сеткі — значны для сучаснай моладзі канал камунікацыі. Працягваем развіваць сайт. Дарэчы, у 2022-м ён заваяваў трэцяе месца ў намінацыі "Адукацыя і навука" інтэрнэт-прэміі TIBO, — распавяла Таццяна Швед.

У ДАПАМОГУ — ЛІТАРАТАРЫ

Як адзначыў старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, заслужаны дзеяч культуры Міхаіл Пазнякоў, супрацоўніцтва дзіцячых бібліятэк з сучаснымі літаратарамі даўно стала добрай традыцыяй і эфектыўным спосабам прыцягнення моладзі.

— Айчынныя творцы заўсёды дапамагалі нам выхоўваць у падрастаючым пакаленні патрыятызм ды любоў да роднай мовы і культурнай спадчыны, — падкрэсліла дырэктар бібліятэкі імя М. Астроўскага. — І сёння сябры Саюза ўласным прыкладам натхняюць юных наведвальнікаў на высокія дасягненні! Дзякуючы сёлетняй акцыі "100 сустрэч з чытачом" і праекту "Кабінет пісьменніка" да нас завітала мноства выбітных дзеячаў.

Так, завяршальным акордам Тыдня дабра, арганізаванага дзіцячай бібліятэкай №10, стала прэзентацыя кнігі Ірыны Карнаухавай "Прелюдия Рахманинова, или Советы пса по кличке Релакс". А літаратарка Святлана Бахнава правяла майстар-клас, прымеркаваны да Сусветнага дня дабрыні.

Цесныя сяброўскія адносіны звязваюць юбіляра і з Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі: у некалькіх бібліятэках сістэмы працуюць профільныя цэнтры, куды прыходзяць і дзеці, і бацькі. Створаная тут база абнаўляецца штомесяц, а значыць наведвальнікі атрымліваюць сапраўды актуальныя звесткі. Рэгулярна ладзяцца ўрокі прававой пісьменнасці, дзе навучэнцы мінскіх школ знаёмяцца з заканадаўчымі асновамі дзяржавы і развіваюць грамадзянскую адказнасць.

НАЦЫЯНАЛКА — ПОБАЧ

Актыўную працу з юнацкай аўдыторыяй ажыццяўляе і галоўная скарбніца Беларусі, дзе з 2024-га функцыянуе дзіцячы кніжны цэнтр.

— У нас дзейнічае праграма "Прафесар", якая прадугледжвае атрыманне навыкаў інфармацыйнага пошуку, адбору і аналізу зместу розных відаў дакументаў, — расказала галоўны бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Вольга Палунчанка. — Тут выкарыстоўваецца той масіў рэдкіх матэрыялаў, якога няма ў іншых установах. Напрыклад, багаты фонд выяўленчых дакументаў.

Сумесна з Міністэрствам адукацыі цэнтр рэалізуе праект "Быць годнымі іх Вялікай Перамогі!". У праграме — цэлая серыя мерапрыемстваў. Гэта і цыкл бібліяграфічных урокаў, і перасоўныя кніжныя выставы "Салют вам, салдаты Перамогі!", і конкурсы творчых работ, і экскурсіі.

У 2025-м, па словах Вольгі Палунчанка, з нагоды юбілею Вялікай Перамогі ўстанова прадставіць шэраг новых ініцыятыў. Сярод іх — заняткі па гісторыі, рэспубліканская навуковая канферэнцыя з удзелам школьнікаў Расійскай Федэрацыі "Застацца чалавекам у полымі вайны", выданне зборніка і манаграфіі па выніках форуму, святочны канцэрт "Мы вартыя іх Вялікай Перамогі" ды многае іншае.

Віялета ГРЫНКЕВІЧ
Фота з сайта Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк г. Мінска

На фота: наведвальнікі Цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі імя М. Астроўскага

Выстава "Цёплыя стасункі" працуе ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў.

Служыць мастацтву і людзям

Прызванне і пастаянны творчы пошук дазваляюць калектыву Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў ужо 100 гадоў аддана служыць мастацтву і людзям. Векавы юбілей — нагода ацаніць свой шлях і вызначыць новыя рубяжы.

Народны хор народнай песні "Маладзік"

Народны харэаграфічны ансамбль "Алеся"

НА ГОДНЫМ МЕСЦЫ

Гісторыя каледжа — гэта летапіс карпатлівай працы, пераадолення цяжкасцей, станаўлення, росквіту, поспехаў і дасягненняў. Ідуць гады, змяняюцца пакаленні, але кожны дзень тут робяць крок да прафесійнага майстэрства па лесвіцы творчага пошуку.

Сёння шматпрофільная навучальная ўстанова займае годнае месца ў сферы культуры нашай краіны. Каледж дамагаецца поспехаў дзякуючы мэтанакіраванасці, энергіі, прафесіяналізму і ўменню беражліва захоўваць традыцыі. З'яўляюцца новыя спецыяльнасці, творчыя калектывы, праводзяцца конкурсы па ўсіх напрамках дзейнасці. Навучэнцы штогод становяцца пераможцамі прэстыжных рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў, фестываляў, атрымліваюць вышэйшыя ўзнагароды ды іншыя заахвочванні спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ

Велізарным патэнцыялам развіцця і выхавання гарманічнай асобы валодаюць творчыя калектывы, якія зберагаюць і папулярызуюць нацыянальную і сусветную культуру. Цяпер у каледжы іх 30, з якіх 12 маюць званне народнага, тры — заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь. Гэта народны харэаграфічны ансамбль "Алеся", народны хор народнай песні "Маладзік", народны аркестр рускіх народных інструментаў.

Высокі прафесіяналізм, шматлікія канцэртныя праграмы, яркае самабытнае майстэрства і ўважлівае захаванне традыцый адрозніваюць народны аркестр беларускіх народных інструментаў, народны сімфанічны аркестр, народны духавы аркестр, народную студыю эстраднага вакалу "Нова", народны хор народнай песні "Ростань", народны акадэмічны хор "Мазаіка", народны ансамбль народнай музыкі "Лянок", народны ансамбль танца "Вянок", народны інструментальны ансамбль. Яны па праве адносяцца да найлепшых калектываў Магілёўшчыны.

ПАРТНЁРСТВА

Ва ўстанове кіпіць жыццё. Рэспубліканскі адкрыты конкурс выканаўцаў на аркестравых інструментах імя Я. Глебава, навукова-практычная канферэнцыя "Міжнародныя чытанні імя М. Рымскага-Корсакава", рэгіянальныя конкурсы прафесійнага майстэрства, семінары-практыкумы, вучэбна-практычныя канферэнцыі, фестывалі, персанальныя выставы даюць дзецям магчымасць праяўляць здольнасці і ўдасканальвацца ў справе.

Каледж цесна ўзаемадзейнічае з арганізацыямі — заказчыкамі кадраў. Партнёрства з установамі дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі грунтуецца на метадычнай і куратарскай дапамозе. Гэта дазваляе стварыць базу для скіраванага на практыку падыходу ў навучанні і забяспечыць юным талентам, якія плануюць звязаць будучыню з культурай і мастацтвам, прафесійную арыентацыю.

Важны складнік — міжнароднае супрацоўніцтва, якое пашырае гарызонты педагогаў і навучэнцаў, спрыяе іх росту. Сярод партнёраў — Бранскі абласны каледж мастацтваў, Пскоўскі абласны каледж мастацтваў імя М. Рымскага-Корсакава, Сургуцкі музычны каледж, Санкт-Пецярбургскае музычнае вучылішча імя М. Рымскага-Корсакава, Наўгародскі абласны каледж мастацтваў імя С. Рахманінава, а таксама Арлоўскі, Смаленскі і Чэлябінскі дзяржаўныя інстытуты культуры.

БЕЗЛІЧ ІДЭЙ

Каледж заўсёды меў сваё аблічча, унікальныя праекты і таленавітых выхаванцаў, здольных падтрымаць традыцыі і прапанаваць новыя ідэі. Навучэнцам належыць задума стварэння моладзевай тэлестудыі "Ракурс" — навучальная платформа згуртавала будучых рэжысёраў, акцёраў, мастакоў, музыкантаў, бібліятэкараў. Аб'яднанне асвятляе падзеі ўстановы, праводзіць сустрэчы з дзеячамі культуры. Значны водгук у гледачоў знайшоў літаратурны музычна-пластычны спектакль "Песня роднай зямлі", які паказалі ўжо ва ўсіх раёнах Магілёўшчыны. Ён уключаны ў план мерапрыемстваў па святкаванні 80-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. У межах арт-праекта "Прастора творчасці" дэманструюцца работы выпускнікоў — самабытных мастакоў, якіх ведаюць па ўсёй Беларусі. Імпрэзы цыкла "Музычныя вечары на Вялікай Садовай" таксама ладзяцца дзякуючы каледжу. Яго калектывы і салісты выконваюць творы сусветных і беларускіх кампазітараў, прадстаўляюць народныя танцы.

НА ДОШЦЫ ГОНАРУ

Так склалася, што ўстанова мяняла назву, месцазнаходжанне, але не прызначэнне — імкнуцца быць найлепшай у сваёй справе. Лёсы тысяч запатрабаваных, таленавітых выпускнікоў упрыгожваюць летапіс каледжа. Сярод іх заслужаныя артысты і дзеячы культуры Беларусі, літаратары і дызайнеры, папулярныя выканаўцы.

Дасягненні ўстановы ў фарміраванні кадравага патэнцыялу айчыннай сферы культуры адзначаны ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў, Нацыянальнага сходу, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Магілёўскага аблвыканкама. За ўклад у развіццё культуры рэгіёна па выніках 2021 года каледж быў занесены на абласную Дошку гонару.

Алена ШАРКОВА,
выкладчык Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў

Праект каледжа — літаратурны музычна-пластычны спектакль "Песня роднай зямлі"



Дырэктар Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў Андрэй Стэльмах:

— Ёсць упэўненасць, што нашы традыцыі, сучасныя падыходы да навучання, выкарыстанне найноўшых педагагічных тэхналогій і далей будуць спрыяць удасканаленню ўсіх напрамкаў творчай дзейнасці ўстановы. Спадзяюся, што ў наступныя стагоддзі каледж застанецца такім жа цэласным арганізмам, які дынамічна і паспяхова развіваецца, а новыя пакаленні з цеплынёй і ўдзячнасцю будуць ушаноўваць нашу родную навучальную ўстанову, з гонарам служыць мастацтву і людзям.

Цэнтр Клімавічаў упрыгожвае надзвычайна вытанчаны будынак, які лічыцца сапраўднай перлінай драўлянай архітэктуры. Былы сядзібны дом Мяшчэрскіх сёння служыць скарбніцай мясцовай гісторыі. У колішняй дваранскай рэзідэнцыі працуе раённы краязнаўчы музей.

Зберагчы памяць роднай зямлі

Будынак, што нагадвае казачны церам, паўстаў у 1867 годзе. Прыцягальны выгляд дому надавалі шматлікія разныя ліштвы ды арнаментальныя паяскі, падобныя на карункі, па-мастацку сплеценыя руплівай майстрыцай. Помнік драўлянага дойлідства перажыў няпростыя гістарычныя выпрабаванні, а сорак гадоў таму ў будынку размясціўся навастворaны музей.

Юбілей установа сустрэла абноўленай. Напярэдадні абласных "Дажынак" завяршылася маштабная рэканструкцыя аб'екта. Адмыслоўцы вярнулі састарэламу дому першапачатковы выгляд, беражліва паставіўшыся да аўтэнтычных элементаў. На рамонтныя і аднаўленчыя работы дзяржава накіравала каля 2,4 мільёнаў рублёў.

Першай часовай экспазіцыяй у абноўленай скарбніцы стала "Соль зямлі Магілёўскай". Фотавыстава прысвечана працаўнікам вёскі, героям сёлетняга жніва. На кожным з 40 здымкаў паўсталі сапраўдныя рупліўцы, што шчыра любяць родную зямлю і сваю нялёгкую справу. Наперадзе не менш цікавыя праекты, што раскрыюць харастро краю, слаўныя старонкі яго гісторыі, таленты нашага народа.

Пастаянная ж экспазіцыя заняла шэсць светлых залаў.

Яна раскрывае гісторыю раёна ад бронзавага веку да сучаснасці. "Прырода і археалогія", "Этнаграфія", "Далёкае мінулае", "Вялікая Айчынная вайна", "Савецкі перыяд", "Сучаснасць" — кожны раздзел напоўнены ўнікальнымі артэфактамі. Сярод іх нямала надзвычайных археалагічных знаходак. Да прыкладу, музей валодае фрагментам керамікі з выявай вадаплаўнай птушкі, узрост якога складае каля 5000 гадоў. Атрымаць падрабязную інфармацыю пра экспанаты можна ў інфакіёсках.

БАГАЦЦІ МІНУЛАГА

Колісь да стварэння збораў прычыніліся людзі розных прафесій. Вайскоўцы і пісьменнікі, рабочыя і журналісты, настаўнікі і школьнікі зрабілі свой унёсак у фарміраванне скарбніцы. І сёння мясцовыя жыхары шчодра дзеляцца сямейнымі рэліквіямі і раптоўнымі знаходкамі. Прыкладам, гэтай вясной мясцовая сям'я падчас шпацыру натрапіла на старажытныя артэфакты, сярод якіх былі наканечнік стралы, нуклеус, праколка. Прадметы, што адносяцца да каменнага веку, перадалі ў раённы краязнаўчы музей.

Сёння фонды налічваюць больш за 17 тысяч рэчаў. Скарбніца валодае багатымі калекцыямі археалогіі, нумізматыкі, зброі, прадметаў побыту, ткацтва, выяўленчых і пісьмовых крыніц. Найстарэйшы экспанат — зуб шарсцістага насарога. Гэтая жывёла колісь насяляла еўрапейскія і азіяцкія абшары ды канчаткова знікла праз кліматычныя змены 14-8 тысяч гадоў таму.

СЛАЎНЫ ЗЯМЛЯК

Гонар калекцыі — творчая спадчына Міхаіла Галынскага. Выдатны мастак з'явіўся на свет на Клімавіччыне. І няхай значную частку жыцця ён праве ў латвійскай Ліепаі, пра бацькоўскі кут ніколі не забываўся. Неяк падарыў Беларусі шэраг сваіх работ. Нямала жывапісных палотнаў і графічных аркушаў пасля смерці Міхаіла Фаміча нашчадкі перадалі на радзіму — паводле апошняй волі творцы.

Перавагу майстра аддаваў партрэту. Маляваў не толькі аднапалчан, родных і блізкіх, але і простых сучаснікаў, што прыцягвалі яго працавітасцю і дабрынёй. Ці то постаць маці, ці то вобраз руплівага аратага — кожная карціна Галынскага струменіцца жыццялюбствам, святлом і любоўю.

ПОВЯЗЬ ВЯКОЎ

Асаблівую ўвагу скарбніца надае працы з дзецьмі і моладдзю. Галасы малечы часта можна пачуць у музейных залах. Паболела юных экскурсантаў і дзякуючы праекту "Урок у музеі" ды ўвядзенню адзінага дня наведвання для школьнікаў. Нярэдка супрацоўнікі самі выязджаюць у навучальныя ўстановы. Плён прыносіць у тым ліку папулярны цяпер фармат "музей у чамадане".

Вядома, не маглі абмінуць увагай 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Да юбілейнай даты музей апублікаваў на сваім сайце каштоўныя ўспаміны землякоў, што прайшлі няпростымі дарогамі вайны, сваёй мужнасцю наблізілі светлы пераможны дзень. Клімавіччына памятае сваіх мужных сыноў і дачок. Сем ураджэнцаў гэтага краю сталі Героямі Савецкага Саюза, два — кавалерамі ордэна Славы. Гэты праект не толькі напамін пра жахі ліхалецця, але і запавет сучаснаму пакаленню — шанаваць і зберагаць мір.

Даніл ШЭЙКА
Фота з архіва ўстановы

Дзісненская паэтка часоў Асветніцтва

Сёння мы распачынаем другую частку серыяла, прысвечанага беларускім жанчынам-творцам з далёкай мінуўшчыны. Новая галоўная гераіня — Тэкля Урублеўская — марыла стаць прафесійнай літаратаркай, аднак лёс заламаў яе музе крылы.

Касцёл Святога Андрэя. Слонім, 2006

Перш чым перайсці да таямніц біяграфіі Тэклі Урублеўскай, трэба паставіць кропкі над "і". Справа ў тым, што дзявочае прозвішча творцы выглядала так: Buzymowska, Burzymowska (Бужымоўская; назва сямейнага фальварка паэткі пад Слонімам — Бужымаў). Гэта вынікае з дакументаў роду XVII—XIX стагоддзяў. У сваёй першай кнізе ў 1817-м аўтарка выбрала іншы варыянт: Tekla z Bórzymowskich Wróblewska (польскія літары u, ó чытаюцца як "у"). Пазней, пэўна, з-за нядбаласці пісараў і саміх прадстаўнікоў фамініі з'явілася форма Borzymowska (па-беларуску, адпаведна, Бажымоўская ці нават Барымоўская), якая стварыла шырокае поле для маніпуляцый. Прыкладам, для атаясамлення Бужымоўскіх з Бажымоўскімі — іх у Рэчы Паспалітай было нямала. Узяўшы гэтую праблему пад увагу, рушым далей.

ВОДГУКІ І КРЫТЫКА

Пра Тэклю Урублеўскую пачалі пісаць адразу пасля выхаду яе першай кнігі, тобок у 1817 годзе. У 1821-м літаратуразнавец Ян Савіньскі зрабіў дэталёвы разбор твораў паэткі. Згадак Урублеўскай і яе спадчыны ў розных публікацыях, слоўніках было вельмі шмат. Але сямейных і родавых таямніц усё адно багата. Нават даты жыцця аўтаркі — прыблізныя.

Сярод прац навукоўцаў вылучым даследаванне Tekla Wróblewska z Dzisny — zapomniana literatka późnego Oświecenia (2005) літаратуразнаўца Дароты Самборскай-Кукуць. Яна зрабіла агляд ранейшых публікацый і прааналізавала творчасць паэткі, немалую частку тэксту прысвяціўшы спробам высветліць паходжанне Урублеўскай. Варта згадаць і артыкул Міколы Хаўстовіча "Тэкля з Бажымоўскіх Урублеўская: на подступах да рамантызму" (2010). Аўтар яшчэ раз спрабуе закрыць гешальт, злучаны з радаводам жанчыны. Праўда, беспаспяхова. Вядома ж, пра Тэклю ёсць невялікі нарыс у "Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі" (1985). Час ад часу імя паэткі гучыць у папулярных нататках, прысвечаных Дзісне: другая палова жыцця Тэклі шчыльна знітавана з гэтым горадам.

ВЕРСІІ ПАХОДЖАННЯ

Паводле гербоўніка Каспара Нясецкага, а дакладней дапоўненага перавыдання (1842, першае выйшла ў 1740-х), Бажымоўскія герба "Бяліна" былі звязаны з Брэстам-Куяўскім і іншымі мясцінамі Польшчы. Звязаны з ёй і род герба "Лада", але існуе згадка, што Станіслаў Бажымоўскі перабраўся ў Полацкае ваяводства. Трэця фамілія, герба "Любіч", адносіцца да Вялікага Княства Літоўскага — Брэсцкага ваяводства і Лідчыны.

Звернемся да больш абазнанага геральдыка Адама Банецкага. Другі том яго гербоўніка пабачыў свет у 1900-м. У гэтай кнізе аўтар падаў важную інфармацыю пра вялікалітоўскі род герба "Любіч". Станіслаў Бажымоўскі за вайсковыя заслугі атрымаў у 1620 годзе ад караля Жыгімонта III землі ў Невельскім павеце (там сяліліся самыя адчайныя людзі, бо гэта было памежжа). Сын Станіслава, Мацей Казімір, з дазволу караля Яна Казіміра ў 1659-м уступіў тыя землі Марцыяну Рэйтану. Банецкі называе і іншых прадстаўнікоў роду, што жылі пазней: Міхала, падчашага і каптуровага суддзю Лідскага павета, выбаршчыка Станіслава Аўгуста Панятоўскага; Юзафа, лідскага земскага суддзю ў 1765-м; братоў Антона, ротмістра нацыянальнай кавалерыі войска ВКЛ, і Тадэвуша, слонімскага гродскага суддзю ў 1797-м.

Дарэчы, Марцыян Рэйтан — прадзед грамадска-палітычнага дзеяча ВКЛ Тадэвуша Рэйтана (1740—1780). Марцыян ажаніўся з Бажымоўскай і асеў на Невельшчыне (у Грушаўку яны перабраліся пасля 1693 года). А куды падзеўся Мацей Бажымоўскі і хто такія Антон ды Тадэвуш?

Касцёл Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі. Дзісна, 1936

Герб "Любіч"

ПРЫ ЧЫМ ТУТ МІЦКЕВІЧ?

Вядомы яшчэ адзін род Бажымоўскіх (згаданыя ніжэй фаміліі — кальвінісцкая шляхта ВКЛ). У нашай гульні ён удзельнічаць не будзе, але, калі гаворым пра Бажымоўскіх, успомніць пра яго варта. Гэта продкі паэта Адама Міцкевіча, прабабуля якога — таксама Бажымоўская. Род пакінуў значны след у гісторыі ВКЛ, у XVII стагоддзі з Бажымоўскіх выйшла нямала вядомых людзей (кальвінісцкія святары, настаўнікі). Ёсць яшчэ адна цікавая паралель. Бабуля Адама Міцкевіча, кальвіністка Тадора Пянкальская, некаторы час пасля шлюбу з Якубам Міцкевічам судзілася праз пасаг з апекунамі Галухоўскімі — хутчэй за ўсё, са сваякамі паэткі Тэафілі Глінскай (яе маці належыць да Галухоўскіх).

Тэкля Урублеўская — беларуская паэтка, перакладчыца, драматург. Частка яе работ выйшла з друку на заранку XIX ст. — аўтарка выдавалася ўласным коштам. Але большасць твораў так і засталася ў рукапісах. Дзякуючы Урублеўскай не знікла памяць пра нашага паэта з Быхаўшчыны Яна Аношку. Тэкля сабрала, апрацавала і выдала асобную кнігу яго вершаў.



Карта родных мясцін Тэклі Урублеўскай

СЛОНІМСКІ НАПРАМАК

Дарота Самборская-Кукуць мяркуе, што наш літаратар Ігнат Быкоўскі (сябар паэткі) і Бажымоўская пэўны перыяд маглі жыць па суседстве ў Слонімскім павеце. Быкоўскі, які часта пераязджаў, у красавіку 1792 года напісаў ліст да караля Станіслава Аўгуста з Луконіцы, што пад Слонімам.

Праверым. Луконіца (Лукавіца), як аказалася, здаўна належала Быкоўскім. Яе гаспадаром у 1690-м быў Дзімітрый Тыша-Быкоўскі, ваўкавыскі мечнік. Літаратар Быкоўскі мог, завітваючы да сваякоў, некаторы час "суседнічаць" з Бажымоўскімі.

Акрамя таго, даследчыца выказала думку, што Бажымоўскія, пэўна, паходзілі з Бажымава (Бужымава) і жылі непадалёк, у вёсцы, уласнікамі якой пазней сталі іх сваякі Папроцкія. Праверым і гэтыя звесткі. Сапраўды, блізу Слоніма некалі быў фальварак Бужымаў, але сёння яго не існуе. Арыенцір для пошуку — вёска Талькаўшчына, якая таксама звязана з Бажымоўскімі.

Вось толькі спадарыня Самборская-Кукуць памыляецца, пішучы, што прозвішча Бажымоўскі з'яўляецца на гэтых абшарах у канцы XVIII стагоддзя (1797). Адным з першых Бажымоўскіх у Навагрудскім ваяводстве быў Мацей (1690) — пэўна, той самы, што ўступіў Марцыяну Рэйтану землі роду на Невельшчыне. Праўда, гэты чалавек жыў у 1690-м у Мазурках — на поўдні цяперашняга Ляхавіцкага раёна (у XVIII стагоддзі там будуць гаспадарыць Рэйтаны). Калі мы ўжо закранулі падымныя рэестры Навагрудскага ваяводства 1690 года, то згадаем іншых сваякоў слонімскіх Бажымоўскіх — Папроцкіх і Палубінскіх. Усе яны таксама жылі ў той мясцовасці ў 1690-м.

ЗАГАДКІ СЯМ'І

Кім былі асобы, што ўпамінаюцца як падпісчыкі на кнігі Урублеўскай, — Канстанцыя Бажымоўская з Тупальскіх, Фердынанд Бажымоўскі, Канстанцыя Палубінская з Бажымоўскіх? Відаць, родзічамі. Канстанцыя Бажымоўская з Тупальскіх названа жонкай брата.

Фердынанд Бажымоўскі нарадзіўся каля 1790 года. У 1830-м ужо былы падкаморы Слонімскага павета ажаніўся з Зоф'яй Папроцкай. Фердынанд адышоў у лепшы свет у Бужымаве на пачатку 1862-га. Шляхціча пахавалі на могілках у Слоніме.

Цяпер — слова пра Людвіка Папроцкага. Ведаючы Тэклю, ён не раз распавядаў сябрам літаратурнай секцыі Таварыства філарэтаў гісторыі з жыцця паэткі. Людвік даводзіўся Зоф'і родным братам, таму мог атрымліваць інфармацыю пра аўтарку з першых добразычлівых вуснаў.

Сёе-тое ўдалося высветліць і пра Канстанцыю з Бажымоўскіх. У 1807-м яна выйшла замуж за пісара Вінцэнта Палубінскага. Памерла ў маёнтку Бужымаў у 1857-м. Нашчадкаў, як і брат Фердынанд, не пакінула.

А цяпер пра Тэклю. У 1800-м у касцёле Святога Андрэя (Слонім) пабраліся шлюбам Адам Урублеўскі і Тэкля Бажымоўская. Імаверна, што гаворка пра нашу гераіню, бо супадзенне надта красамоўнае.

БАЦЬКІ ФЕРДЫНАНДА І КАНСТАНЦЫІ

Некалькі знойдзеных дакументаў сведчаць, што гэта Тадэвуш Бажымоўскі і Юзэфа Пясецкая. Тадэвуш, у адрозненне ад братоў Міхала і Антона, зрабіў добрую кар'еру. У 1776-м ён — лідскі харунжы, у 1781—1787-м — гусарскі паручнік, пазней абіраецца дэпутатам на Галоўны Трыбунал ВКЛ, у 1787—1797-м — слонімскі гродскі суддзя. Сканаў 30 кастрычніка (ст. ст.) 1828 года ў маёнтку Вераб'евічы, маючы 76 гадоў. Тадэвуша пахавалі, як напісана ў метрыцы, побач з магіламі продкаў ва ўніяцкай капліцы ў Талькаўшчыне. Ёсць у дакументце яшчэ адна цікавінка: Тадэвуш Бажымоўскі памёр удаўцом, пакінуўшы сына Фердынанда і дачку Канстанцыю. Калі і Тэкля была яго дачкой, то чаму не згадваецца? Магчыма, таму, што жыла працягла час ледзь не на іншым канцы свету, у Дзісне (каля Полацка), і бацькоў апякалі малодшыя дзеці.

ДЗЯДЫ. ПУНКТ АДЛІКУ

Дзедам Фердынанда, Канстанцыі (і Тэклі?) быў Юзаф Адам Бажымоўскі, вельмі заўважны ў Лідскім павеце чалавек. Па кар'ерных прыступках ён падымаўся няспешна, але няўхільна. У 1744-м Юзаф — скарбнік, напрыканцы 1745-га атрымлівае прывілей на граднічага, у 1754-м — падчашы лідскі. На пачатку 1765 года Бажымоўскі даслужыўся да адной з вышэйшых пасад павятовай іерархіі — пасады земскага суддзі, якую займаў да скону. У дадатак у 1771-м быў абраны дэпутатам Галоўнага Трыбунала ВКЛ. Ажаніўся Юзаф Бажымоўскі з прадстаўніцай старога роду Мар'янай Нарбут, з якой меў сыноў Міхала (ротмістр лідскі), Тадэвуша (бацьку Тэклі?) і Антона Фердынанда (ротмістр кавалерыі). Валодаў фальваркамі Гімбуты, Шпыркаўшчына, Вераб'евічы, Дубрава, або Траццякоўшчына (Траццякоўцы), Жалудок і Сакаліншчына. Памёр 30 верасня 1782 года.

На гэтым аповед аб радаводзе завяршаецца. Далей прадставім жыццяпіс паэткі. Але архіўны пошук працягваецца: сухую і сціплую інфармацыю хочацца расквеціць цікавымі падзеямі, а іх, як правіла, апісваюць судовыя кнігі. Можа, нам пашанцуе.

Зміцер ЮРКЕВІЧ

Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2025 года

Газета "Культура"

Індывідуальны
63875
1 мес. – 16,43 руб., 3 мес. – 49,29 руб., 6 мес. – 98,58 руб.

Ільготны ведамасны
638722
6 мес. – 145,38 руб.

Ведамасны
638752
1 мес. – 26,61 руб., 3 мес. – 79,83 руб., 6 мес. – 159,66 руб.

Індывідуальны льготны
63872
6 мес. – 90,89 руб.

Ільготны
(для юрыдычных асоб, якія афармляюць падпіску сваім супрацоўнікам і пенсіянерам)
63879
1 мес. – 18,18 руб., 3 мес. – 54,54 руб., 6 мес. – 109,08 руб.

Газета "Культура" і часопіс "Мастацтва" (камплект)

Індывідуальны
63874
1 мес. – 34,71 руб., 3 мес. – 104,13 руб., 6 мес. – 208,26 руб.

Ільготны ведамасны
638772
6 мес. – 355,02 руб.

Ведамасны
638742
1 мес. – 62,74 руб., 3 мес. – 188,22 руб., 6 мес. – 376,44 руб.

Індывідуальны льготны
63877
6 мес. – 197,17 руб.

Часопіс "Мастацтва"

Індывідуальны
74958
1 мес. – 21,61 руб., 3 мес. – 64,83 руб., 6 мес. – 129,66 руб.

Ільготны ведамасны
749412
6 мес. – 229,10 руб.

Ведамасны
749582
1 мес. – 42,27 руб., 3 мес. – 126,81 руб., 6 мес. – 253,62 руб.

Індывідуальны льготны
74941
6 мес. – 117,38 руб.

Ільготны
(для юрыдычных асоб, якія афармляюць падпіску сваім супрацоўнікам і пенсіянерам)
74986
1 мес. – 23,88 руб., 3 мес. – 71,64 руб., 6 мес. – 143,28 руб.

Падрабязней – на сайце kultura-info.by

Афіша з 29 лістапада па 6 снежня

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20, тэл.: 8 017 3970163 (экскурсійнае бюро)

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Канцэрт **"Сем карцін Густава Клімта"**, арганізаваны сумесна з беларуска-французскай асацыяцыяй "Жыццё ў музыцы" пад кіраўніцтвам айчыннага кампазітара Георгія Сасноўскага. **30 лістапада ў 16.00.**
- Выстава **"Сямён Дамарад. Краявіды радзімы"**. Каля 50 жывапісных твораў з майстэрні аўтара і фондаў музея. **Да 2 снежня.**
- Выстава **"Андрэй Заспіцкі. У сэрцы — Беларусь"**. Выставачны корпус, вул. К. Маркса, 24, паверх 4, зала 3. **Да 8 снежня.**
- Выстава **"Чароўная тканіна прыроды Івана Дмухайлы"**, прымеркаваная да 110-годдзя з дня нараджэння заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Івана Сямёнавіча Дмухайлы (1914—2007). **Да 8 снежня.**
- Выстава сябра Віцебскай арганізацыі Беларускага саюза мастакоў Леаніда Леанідавіча Мядзведскага **"Метамарфозы колеру і вобразаў"**. **Да 14 снежня.**
- Выстава работ людзей з асаблівасцямі псіхічнага і фізічнага развіцця **"Асаблівы дар"**. **Да 20 снежня.**
- Выстава **"Страты і вяртанні. Лёс мастацкіх каштоўнасцей Дзяржаўнай карціннай галерэі. 1939—1957"**, прымеркаваная да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 85-годдзя Нацыянальнага мастацкага музея. **Да 20 студзеня 2025 года.**
- Экскурсіі: **"Самыя-самыя..." (6+)**, **"Якога колеру зіма?" (6+)**, **"Казкі Усходу" (10+)**, **"Міфы Старажытнай Грэцыі і Рыма" (10+)**, **"Партрэты даўніх мінулых пакаленняў..." (10+)**, **"Пяць моў кахання" (16+)**, **"Жаночы партрэт" (16+)**, **"Мінск у музеі" (16+)**. **Праводзяцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА 1-Й ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а, тэл.: 8 017 3637796, 8 017 3588878

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Выстава жывапісу бытавога жанру **"Імгненні жыцця"** XIX — пачатку XX стагоддзя з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея. **Да 18 студзеня 2025 года.**
- Праграма **"Кафляныя «люстэркі» шляхецкай сядзібы"**. **Праводзяцца заўсёды.**
- Квэст **"Таямніцы старажытнай сядзібы"**. Папярэдні запіс. **Праводзяцца заўсёды.**
- Квэст **"Пошукі мінулага"**. **Праводзяцца заўсёды.**
- Экскурсія **"Інтэр'ер шляхецкай сядзібы"**. Папярэдні запіс. **Праводзяцца заўсёды.**
- Экскурсія **"Шлях мастака Валенція Ваньковіча"**. Папярэдні запіс. **Праводзяцца заўсёды.**
- Экскурсія **"Сядзібны партрэт"**. Папярэдні запіс. **Праводзяцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

Мінскі р-н, Астрашыцка-Гарадоцкі с/с, в. Аколіца, вул. Іванаўская, 17б, тэл.: 8 017 5074468

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- **Батлеечны спектакль. Праводзяцца заўсёды.**
- Майстар-клас **"Саломапляценне"**. **Праводзяцца заўсёды.**
- Майстар-клас **"Лялька-мотанка"**. **Праводзяцца заўсёды.**
- Майстар-клас **"Ткацтва"**. **Праводзяцца заўсёды.**

УНП 100377771

МАГІЛЁЎСКІ АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

г. Магілёў, вул. Першамайская, 7,
тэл.: 8 0222 656604 (каса),
сайт: **mdrama.by**

• Рамантычная камедыя ў 2 дзеях **“Я бяру гэтага хлопца” (16+)**. **29 лістапада ў 18.30.**
• Музычная казка ў 1 дзеі **“Дзюймовачка” (0+)**. **30 лістапада ў 12.00.**
• Класічная камедыя ў 2 дзеях **“Лес” (12+)**. Прэм’ера. **30 лістапада ў 18.30.**
• Музычная казка ў 1 дзеі **“Брыдкае качаня” (0+)**. **1 снежня ў 12.00.**
• Містычная легенда ў 2 дзеях **“Пан Твардоўскі” (14+)**. Гастролі Палескага драматычнага тэатра. **1 снежня ў 18.30.**
• Монаспектакль **“Выратаваць камер-юнкера Пушкіна” (18+)**. Гастролі Луганскага акадэмічнага музычна-драматычнага тэатра імя М. Галубовіча. **3 снежня ў 18.30.**
• Трагікамедыя **“Апошняе каханне Дзеда Мароза” (16+)**. Гастролі Луганскага акадэмічнага музычна-драматычнага тэатра імя М. Галубовіча. **4 снежня ў 18.30.**
• Кіч у 2 дзеях **“Піковая дама” (18+)**. Начны паказ і фотасэт у дэкарацыях. **5 снежня ў 19.30.**
• Prank comedy ў 2 дзеях **“Шалёныя грошы” (16+)**. **6 снежня ў 18.30.**

УНП 700184039

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7,
тэл.: 8 017 3654237, 8 017 3576627,
пошта: kupalabilet@mail.ru

• Містычная легенда пра каханне ў 1 дзеі **“Чорная панна Нясвіжа” (12+)**. Галоўная сцэна. **29 лістапада ў 19.00.**
• Канцэрт у цемры **“Дым над вадой” (12+)**. Жывы гук. Імпрэза праводзіцца па вул. Валгаградскай, 35. **30 лістапада ў 19.00.**
• Паказ **“Моднае сузор’е” (0+)**. Галоўная сцэна. **1 снежня ў 15.30 і 18.00.**
• Рэквіем у 1 дзеі **“Вечар” (12+)**. Галоўная сцэна. **4 снежня ў 19.00.**
• Драма **“А зоры тут ціхія” (12+)**. Галоўная сцэна. **5 снежня ў 19.00.**
• Трагікамедыя **“Дзядзечкаў сон” (16+)**. Прэм’ера. Галоўная сцэна. **7 снежня ў 19.00.**
• Канцэрт у цемры **“Ёсць у мяне толькі ты” (18+)**. Жывы гук. Імпрэза праводзіцца па вул. Валгаградскай, 35. **7 снежня ў 19.00.**

УНП 100377901

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1,
тэл.: 8 017 2431041 (каса),
8 017 3615493

• Канцэрт **“Іншы Моцарт” (12+)**. Камерная зала імя Л. П. Александроўскай. **29 лістапада ў 19.30.**
• Экскурсія **“Унікальны свет закулісся Вялікага тэатра Беларусі” (6+)**. **30 лістапада ў 14.00.**
• Опера **“Яўген Анегін” (12+)**. Прэм’ера. **30 лістапада ў 18.00.**
• Музычны спектакль у 1 дзеі па матывах аднайменнай оперы **“Казка пра цара Салтана” (6+)**. Прэм’ера. **1 снежня ў 11.00.**
• Балет у 2 дзеях **“Шчаўкунок” (6+)**. **1 снежня ў 18.00, 6 снежня ў 19.00.**
• Канцэрт **“Шчасце маё...” (12+)**. Музыка ў стылі танга. Камерная зала імя Л. П. Александроўскай. **1 снежня ў 18.30.**
• Опера ў 3 дзеях **“Кармэн” (12+)**. **3 снежня ў 19.00.**
• Балет у 2 дзеях **“Папялушка” (6+)**. Прэм’ера. **4 снежня ў 19.00.**
• Канцэрт **“Contrabass-live. Зіма” (12+)**. Камерная зала імя Л. П. Александроўскай. **4 снежня ў 19.30.**
• Опера ў 4 дзеях **“Травіята” (16+)**. **5 снежня ў 19.00.**
• Опера ў 1 дзеі **“Моцарт і Сальеры” (12+)**. Драматычныя сцэны А. Пушкіна. **6 снежня ў 19.30.**

УНП 191081322

*
Вялікі тэатр Беларусі
аб’яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па творчай спецыяльнасці “Мастацкі кіраўнік”.
Дадатковая інфармацыя па тэлефоне:
8 017 3511223.
УНП 191081322

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК “НЯСВІЖ”

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19,
тэл.: 8 01770 20602, 8 01770 20660,
8 029 5518051, 8 029 1903149

Палацавы ансамбль
• Урачыстае адкрыццё выставачнага праекта **“Не пакідай мяне, мой светлы сум”** скульптараў Льва і Сяргея Гумілеўскіх. Вялікая выставачная зала. **29 лістапада ў 15.00.**
• Тэатралізаваная экскурсія **“Гісторыя адной каралевы”**. **30 лістапада з 12.00.**
• Часовая экспазіцыя **“Звяжам свет прыгажосцю”**. Калекцыйная зала “Нумізматыка і фалерыстыка”. **З 30 лістапада 2024 года да 26 студзеня 2025 года.**
• Тэатралізаваная экскурсія **“Тэатральны экспромт”**. **1 снежня з 12.00.**
• II фестываль-конкурс харавой музыкі **“Хорам яднаныя”**. Тэатральная зала. **6—7 снежня ў 16.00.**
• Выстава **“Маджарскія: армянскі род у гісторыі Беларусі”**. Калекцыйныя залы “Слуцкія паясы”. **Да 31 снежня.**
• Міжнародны выставачны праект **“Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара”**. **У складзе пастаяннай экспазіцыі.**
• Квэст **“Палацавыя таямніцы”**.
• Віртуальныя выставы: **“Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны”**, **“Нясвіж — здабытак сусветнай культуры”**, **“Разбуральны след вайны ў архітэктуры Нясвіжа”**, **“Шэдэўры калекцыі і ўнікальныя артэфакты музея-запаведніка «Нясвіж»”**.
• Тэматычныя і аглядныя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках Нясвіжа.

Інфармацыйна-касавы цэнтр (г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1)
• Экспазіцыя твораў Наталлі Гузняк **“...Я так бачу”**. **Да 15 студзеня 2025 года.**

Ратуша
Пастаянныя экспазіцыі
• **“Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII — 1-й палове XIX ст.”.**
• Калекцыя гадзіннікаў XIX—XX стагоддзяў **“Культура часу”**. З фондаў музея-запаведніка.

Мерапрыемствы
• Квэсты: **“Безаблічны артэфакт”**, **“Карта сямі каралеўстваў”**, **“Музейны дэтэктыў”**, **“Музейнае расследаванне”**.
• Культурныя мерапрыемствы: **“Прыём у княгіні”**, **“Дзень нараджэння ў ратушы”** (група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў).
• Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **“Школа шпіёнаў”** (да 25 чалавек).
• Гульня-знаёмства **“Музейка аб музеі”** (група да 25 чалавек ад 4 да 7 гадоў).
• Гульнявая праграма **“Выкрунтасы”** (група да 25 чалавек).

Падрабязнасці па тэлефонах 8 01770 20602, 8 01770 20660 або на сайце **niasvizh.by**.

УНП 600207920

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС “МІР”

г. п. Мір, Карэліцкі р-н,
Гродзенская вобл.,
тэл.: 8 01596 36290,
8 01596 36270

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Экспазіцыя **“Арсенал: ваенная зброя ў гістарычным кантэксце”**. Сумесны праект з Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеем. Паўночны корпус. **Да 22 кастрычніка 2025 года.**
• **Лекцыя-візуалізацыя. Кожную сераду і суботу.**
• Экспазіцыя **“Войны XX стагоддзя. Гета ў Мірскім замку”**.
• Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
• Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
• Экскурсія для дваіх **“Інтрыгі Купідона”**.
• Сямейная квэст-экскурсія **“Легенды і паданні Мірскага замка”**.
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **“Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце”**, **“Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст.”**, **“Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст.”**, **“Печы з каробкавай кафлі XVI—XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў”**.

УНП 590201541

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8,
тэл.: 8 017 2030792, 8 029 1440792,
8 017 3271166

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Часовая экспазіцыя **“Музей, якому служыш”**, прысвечаная 80-годдзю ўстановы.
• Часовая экспазіцыя **“Адзінай памяці верныя”**, прысвечаная 80-годдзю вызвалення Беларусі.
• У продаж паступілі сертыфікаты на наведванне экспазіцыі музея.

Падрабязнасці ў сацыяльных сетках і на сайце **warmuseum.by**.

УНП 100235472

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Някрасава, 3,
тэл.: 8 017 2350331,
час працы: серада — нядзеля
з 12.00 да 20.00

• **Выстава пераможцаў Нацыянальнай прэміі ў галіне выяўленчага мастацтва ў 2023 годзе:**
— Персанальная выстава твораў Аляксандра Шапо **“Дрэва дарог”**. **Да 15 снежня.**
— Персанальная выстава твораў Васіля Васільева **“Іерусалім. Спёка і холад Вечнага горада”**. **Да 15 снежня.**
— Персанальная выстава твораў Усевалада Швайбы **“Апярэнне ліній”**. **Да 15 снежня.**
— Персанальная выстава твораў Марты Шчэрбіч **“Пачатак”**. **Да 15 снежня.**
• Выстава твораў з фонду НЦСМ **“Цёплыя стасункі”**. **Да 16 лютага 2025 года.**

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47,
тэл.: 8 017 2350332, 8 017 3990978,
час працы: аўторак — нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Выстава **“Рэха мадэрнізму. Ад Манэ да Кандзінскага”**. **Да 19 студзеня 2025 года.**

УНП 192543414

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР “ЛЯЛЬКА”

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2,
тэл.: 8 0212 669077 (каса)

• Маляўнічая казка ў 1 дзеі **“Як куранятка голас шукала” (0+)**. Фае тэатра. **30 лістапада ў 11.00.**
• Казка ў 1 дзеі **“Марозка” (3+)**. Глядзельная зала. **1 снежня ў 11.00.**
• Інтэрактыўны спектакль **“Казкі чароўнага лесу” (2+)** ад тэатра лялек “Ухтышка”, Віцебск. Фае тэатра. **7 снежня ў 17.00, 8 снежня ў 11.00.**

УНП 300001869

МУЗЕЙ В. К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37,
тэл.: 8 0222 650203,
8 0222 658800

• **Пастаянныя экспазіцыі.**
• Art-lectorium **“Зразумелае мастацтва”**. **Праводзіцца заўсёды.**

Падрабязней на сайце **artmuseum.by** альбо па тэлефонах 8 0222 650203, 8 0222 658800.

УНП 100377771

*
Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь
аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.
Тэлефоны: **8 017 3970163**, **8 025 6677819**.
УНП 100377771

2006 2010 2022
КУЛЬТУРА
Сайт: kultura-info.by
E-mail: kim@kultura-info.by

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА). Выдаецца на беларускай мове.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".

Дырэктар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.
Рэдакцыя газеты "Культура": Галоўны рэдактар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.
Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна.
Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ.
Рэдактары аддзелаў — Віктар ГАЎРЫШ, Данііл ШЭЙКА.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.
Тэлефон: 8 017 2860797.
Тэлефон-факс: 8 017 3345741.
Бухгалтэрыя: 8 017 3345735.
Рэкламны аддзел: 8 017 2860797.
Падпісныя індэксы: 63875, 638752, 63879.
Ільготныя на паўгоддзе: 63872, 638722 (зніжка 15 %).
Камплект (газета "Культура" і часопіс "Мастацтва"): 63874, 638742 (зніжка 10 %).

Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванне аўтара можа не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

Набыць газету ў Мінску можна ў крамах "Белдрук" на пр-це Незалежнасці, 48, і Пераможцаў, 5, на вул. Лабанка, 2, Валадарскага, 16, Няміга, 30, Леніна, 18, Максіма Багдановіча (ля прыпынку "Ст. м. «Няміга»"), у падземных пераходах на плошчы Перамогі і станцыі метро "Пятроўшчына".

Падпісана ў друк 28.11.2024 у 16.00. Замова № 2562. Наклад 3463.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва «Беларускі Дом друку»". 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.
© "Культура", 2024.
Рознічны кошт — па дамоўленасці.
* — матэрыял на правах рэкламы.